Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬЕЗД

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІПЕНЬ 13 1933 г. ЧАЦЬВЕР № 153 (4697) Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

МОСКВА, Старая Площадь 4 ЦК ВКП(б) Газетному Сектору АПО
янв. дек. |Зьв.-2|

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Зьезд бальшавіцкай падрыхтоўкі.

Прывітаньні зьезду калгасьнікаў-ударнікаў т. т. МОЛАТАВУ, КАЛІНІНУ, ГІКАЛО, ЗАХ. АБКОМУ УсеКП(б) І ЗАХ. АБЛВЫКАНКОМУ (1 стар.).

Х. ДУНЕЦ — Пакончыць з вялікадзяржаўніцкімі тэндэнцыямі ў кінопрамысловасьці БССР (2 стар.). На справе давесьці сваю адданасьць партыі (3 стар.).

Лісты рабселькораў (2 стар.).

Урачыстая закладка вялікага опэрна - драматургічнага тэатру БССР (4 стар.).

Хутчэй перабудоўваць работу чыгуначнага транспарту (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ

Германскі камсамол — у авангардзе антыфашысцкай барацьбы (4-я стар.).

Масавыя арышты і аблавы па ўсёй Германіі (4 стар.).

НА ЛЕНДАНСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ. Заява савецкай дэлегацыі (4 стар.).

Зьезд бальшавіцкай падрыхтоўкі

Учора завяршыўся другі ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў.

З прыбуцьцю зьезду прадстаўнікі лепшых калгасаў рабілі справаздачу перад усёй краінай, перад усім калгасным сялянствам аб выніках першага этапу барацьбы за ўраджай, аб выніках першай бальшавіцкай вясны другой пяцігодкі.

Іх прамовы гучэлі ўпэўненасьцю ў заўтрашнім дні і глыбокай удзячнасьцю партыі і яе правадыру тав. **Сталіну**, які паказаў ім шлях да новага заможнага жыцьця.

Зьезд паказаў, якім адданым актывам абружана партыя, якіх герояў-энтузіястаў калгаснай справы з асяродзьдзя беспартыйных сялян выхаваў калгасны лад.

Зьезд паказаў, што партыя, дзякуючы разгрому сабатажу кулацкіх элементаў, арганізацыі палітгадзелаў і мабілізацыі калгасных мас вакол лёзунгу тав. Сталіна—зрабіць усіх калгаснікаў заможнымі—дабілася значных зрухаў ва ўздыме сельскай гаспадаркі. Гэта пацьвярджаецца і вялікім прылівам у калгасы ў дні веснавой сяўбы.

Першая бальшавіцкая сяўба, другой пяцігодкі ярка прадэманстравала тыя вялізарныя зрухі, якія адбыліся ў сьвядомасьці калгасных мас, у іх адносінах да калгаснай працы і калгаснай маемасьці.

Але ці можам мы задаволіцца вынікамі, вынікамі, першымі посьпехамі ў барацьбе за ўраджай?

Ні ў якім разе, ні на хвіліну самасшчакою.

Вынікі сяўбы, ажыцьцяўленьня лёзунгу тав. Сталіна аб заможнасьці будуць залежаць ад таго, як мы правядзем прасоўку і ўборку і здачу сельгаспрадукцыі дзяржаве—так паставіў пытаньне зьезд калгаснікаў-ударнікаў.

УЗЬНЯЦЬ КАЛГАСНЫЯ МАСЫ НА ДАЛЕЙШУЮ БАРАЦЬБУ ЗА ЎРАДЖАЙ, ЗА ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ЎБОРКІ Ў КАЙКАРАЦЕЙШЫЯ ТЭРМІНЫ БЯЗ СТРАТ І ПАСТАЎКУ ЗБОЖЖА ДЗЯРЖАВЕ—ВОСЬ ЗАДАЧА, ЯКАЯ ЗАРАЗ ПАЎСТАЕ ПЕРАД КОЖНЫМ ДЭЛЕГАТАМ ЗЬЕЗДУ ПАСЬЛЯ ПРЫЕЗДУ Ў СВОЙ КАЛГАС.

Кожны калгаснік павінен даведацца аб тым, што было на зьезьдзе. Кожны дэлегат павінен зрабіць справаздачу аб рабоце зьезду ў сваім і ў суседнім калгасе. **Няхай кожны дэлегат стане баявым арганізатарам ўборкі і здачы прадукцыі дзяржаве як у сваім, так і ў суседніх калгасах.**

Рашэньні зьезду — шырока прасунуць у масы, у кожны калгас, у кожную брыгаду, у кожную калгасную хату—вось задача дэлегатаў зьезду і партыйна-савецкіх арганізацый на вёсцы.

Шырокай палітычнай і арганізатарскай работай у масах, умацаваньнем пастаянных калгасных брыгад, правільнай расстаноўкай сіл у брыгадах і зьвенніках, бязьлітасна змагаючыся з кулацкімі спробамі сарваць апрацоўку пасеваў і падрыхтоўку да ўборкі і датэрміновай пастаўкі прадукцыі дзяржаве—забясьпечым высокі ўраджай сельска-гаспадарчага году.

Лён, канопкі, бульба, гародніна зай маюць значную ўдзельную вагу ў нашай сельскай гаспадарцы. Старая вёска зусім ня ведала машын па ўборцы гэтых культур. За апошнія гады савецкія заводы далі саўгасам і калгасам тысячы ільнацерабілак і бульбакапалак. Праўда, гэтых машын яшчэ не хапае. Але нават і тыя, якія ёсьць, мы яшчэ не скарыстоўваем як належыць. **Адсюль задача, у бліжэйшыя-ж дні адрамантаваць усе машыны, падрыхтаваць кваліфікаваныя кадры для работы на гэтых машынах, асабліва кадры ільнацерабільшчыкаў.**

Треба зараз-жа ўстанавіць пільны нагляд за пасевамі і ўжываць быстрачную ўборку на меры іх пасьпяваньня.

НЯ ДАЦЬ УРАДЖАЮ ПЕРАСТАЯЦЬ НА КОРАНІ, НЕ ДАПУСЬЦІЦЬ АБСЫПАНЬНЯ НІ АДНАГО ЗЯРНЯЦІ.

Важнейшае значэньне набывае зараз уборка сенажацяй. Сена—гэта кармы для прадукцыйнай і рабочай жывёлы. Сока — гэта кармы для жывёлы калгаснікаў. Сенаўборка павінна быць закончана ў бліжэйшыя-ж дні, каб вызваліць усе сілы для ўборкі збожжавых і ільну. Марудзіць далей з сенаўборкай—гэта проста злачынства.

Скасіць, высушыць і ўбраць усё сена, выканаць здачу сена дзяржаве—гэта справа гонару кожнага калгасу, кожнага дэлегата зьезду.

Завяршыць праполку ўсіх збожжавых культур, першае і другое поліва ільну, баранаваньне і акучваньне бульбы—ня менш важная задача. Гэтым мы зьнішчым пустаслоўе, пазбысім ураджай сацыялістычных палёў. Рашучы адпор кулацкім спробам сарваць апрацоўку палёў.

Не зацягваць абмалоту, з першых-жа дзён малаціць, разгарнуць пастаўку збожжа, ільну і іншых культур дзяржаве, прычыні, самай высокай якасьці—вось у чым важнейшая задача. Кожны дэлегат зьезду павінен стаць сапраўдным арганізатарам пастаўкі с.-г. прадукцыі дзяржаве.

У выніку пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы мы дабіліся ўступленьня ў калгасы новых мас аднаасобнікаў. Адпак, у нашай рэспубліцы ўдзельная вага аднаасобнікаў у плянах уборкі і пастаўкі с.-г. прадукцыі дзяржаве яшчэ даволі значная. Таму арганізацыя аднаасобнікаў на пасьпяховае правядзеньне прапалачных і ўборачных работ і выкананьне сваіх абавязкаў перад дзяржавай — першачарговая задача партыйных і савецкіх арганізацый на вёсцы.

Змагаючыся з недапэнкай аднаасобніка і з фактамі сабатажу з боку паасобных аднаасобнікаў, арганізуючы аднаасобныя масы сялянства на пасьпяховае правядзеньне поліва, уборкі і пастаўкі с.-г. прадукцыі дзяржаве, мы даб'ёмся далейшых посьпехаў па ўцягненьні ў калгасы лепшых аднаасобнікаў.

Уборка сацыялістычнага ўраджаю —ёсьць той баявы плацдарм, на якім павінны зараз разгарнуцца магутныя сілы, закладзеныя калгасным ладам.

Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі і яе правадыра тав. **Сталіна**, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б на чале з тав. **Гікало**, пад сьцягам сацыялістычнага спаборніцтва з Заходняй вобласьцю, абвешчанага другім усебеларускім зьездам калгаснікаў-ударнікаў—з посьпехам завершым барацьбу за ўраджай, з посьпехам закончым першы сельска-гаспадарчы год другой бальшавіцкай пяцігодкі.

Закрыўся 2-гі ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў

Заключнае пасяджэньне зьезду

Чацьвертае заключнае пасяджэньне зьезду (раніца 12 ліпеня) адкрывае тав. **Галадзед**. Зьездам прымаюцца пры вітальныя тэлеграмы на імя **СНК СССР і тав. Молатава, ЦВК СССР і тав. Калініна, СНК БССР тав. Галадзеда і ЦВК БССР тав. Чарвякова.**

Пасьля прыняцьця тэлеграм слова даецца старшыні цэнтральнай камісіі па сацспаборніцтве з Заходняй вобласьцю, члену бюро ЦК КП(б)Б тав. Картукову. Тав. Картукоў агалашае пастанову камісіі аб прэміяваньні перадавых раёнаў, сельсаветаў, калгасаў і асобных калгаснікаў-ударнікаў па ўдарным тэмпы работы ў часе веснавой сяўбы.

Слуцкі раён, які скончыў адным з першых у БССР сяўбу яравых, прэміяваны пераходным чырвоным сьцягам ЦК КП(б)Б і аўтамашынай, **Рагачоўскі раён** атрымаў прэмію ў 5.000 руб., **Бяльніцкі**—3.000 руб., **Шклоўскі** раён, які першым у БССР скончыў сяўбу ільну, прэміяваны чырвоным пераходным сьцягам імя ОНК БССР, **Барысаўскі** раён, які скончыў сяўбу першым па цэнтральнай зоне, прэміяваны пераходным чырвоным сьцягам імя X зьезду Саветаў.

З перадавых па сяўбе МТС прэміі атрымалі: **Танежыцкая** (Чырвона-Слабодзкага раёну)—5.000 руб., **Цяпуская** (Бабруйскі раён) — 4 тыс. руб., **Шклоўская**—3 тыс. руб. З перадавых сельсаветаў прэміяваны **Слабода-Бычанскі** (Барысаў), **Астравіцянскі** (Полацак) і **Валасавіцкі** (Парычы).

***

Пад гукі аркестру і бурныя апладысмэнты на трыбуну ўзьнімаецца Шклоўская дэлегацыя. Тав. **Галадзед** перадае ёй чырвоны сьцяг. Шклоўскіх калгаснікаў зьмяняюць барысаўскія. Яны атрымліваюць чырвоны сьцяг з рук старшыні ЦВК БССР тав. **Чарвякова**. У залі чуецца голас аднаго з калгаснікаў смалявіцкай дэлегацыі:

— Мы, вашы суседзі, пастараемся ў часе ўборкі і здачы с.-г. прадукцыі дзяржаве адставаць у вас чырвоны сьцяг.

Перадаючы барысаўскай дэлегацыі чырвоны сьцяг, тав. Чарвякоў гаворыць:

— У першыя гады савецкай улады ў БССР Барысаўскі раён наведаў тав. Калінін. Барысаўскія батракі і безьзямельныя беднякі паднесьлі тады тав. Калініну ў падарунак лапці і шэрую сьвітку. Гэты падарунак прадстаўляў сабою тое становішча, у якім знаходзілі ся батракі і безьзямельныя беднякі Барысаўшчыны пры самаўладзьдзе. Зараз Варысава не пазнаць. Ён ператварыўся ў адзін з прамысловых цэнтраў Беларусі. Вялікія посьпехі атрыманы пра цоўнымі масамі Барысаўшчыны і ў галіне перабудовы сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад.

Першую прэмію па індывідуальным прэміяваньні атрымлівае калгаснік-ударнік **БАЙДУКОЎ СЬЦЯПАН** (Барысаўскі раён). Стаць гадамі, але бадзёры духам, узыходзіць ён на трыбуну. Тав. Картукоў перадае яму вызначаную прэмію—шатэфон.

— Гэтым музычным інструментам,— зварачаецца да Байдука тав. Картукоў,— ты будзеш цешыць унукаў, заахвочваць калгаснікаў-ударнікаў, каб яны з яшчэ большым энтузіязмам і энэргіяй змагаліся за сваячасовую і добраякасную ўборку сацыялістычнага ўраджаю і датэрміновае выкананьне сваіх абавязкаў перад дзяржавай.

Слова для адказу атрымлівае Байдук Сьцяпан. Гаворыць ён ціха, але ў кожным яго слове адчуваецца бадзёрасьць, жаданьне працаваць па-ўдарнаму і надалей.

— Мы дабіліся перамогі,—гаворыць т. Байдук,—але дасталася яна нам нялёгка. Патрэбна было шмат сіл і энэргіі. Мы, калгаснікі-ўдарнікі Барысаўшчыны, пастараемся паставіць работу так, каб і ў часе ўборкі ўраджаю і здачы прадукцыі дзяржаве таксама выйсьці пераможцамі, перадавымі раёнам у БССР.

***

У прэзыдыуме зьяўляюцца прыбыўшыя на заключнае пасяджэньне зьезду першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. **ГІКАЛО**, сакратар абкому УсеКП(б) Заходняй вобласьці тав. **РУМЯНЦАЎ**, старшыня аблвыканкому тав. **РАКІТАЎ**, тав. **УБАРЭВІЧ** і тав. **АРАНШТАМ**. Дэлегаты зьезду вітаюць іх гучнымі воплескамі.

Зьезд прыняў абавязацельства калгаснікаў Беларусі па спаборніцтве з Заходняй вобласьцю на лепшае правядзеньне ўборкі ўраджаю і здачы с.-г. прадукцыі дзяржаве.

З вялікай увагай заслухоўваюць дэлегаты выступленьне старшыні аблвыканкому Заходняй вобласьці тав. Ракітава. Сваё выступленьне т. Ракітаў прысьвячае галоўным чынам тэй барацьбе, якую праводзілі калгаснікі і працоўнае сялянства Савецкай Беларусі і Заходняй вобласьці ў часе сяўбы, спаборнічаючы паміж сабою.

— Па выкананьні агульнага плану сяўбы,—гаворыць тав. Ракітаў, — пер шынства заваявалі калгаснікі і працоўныя Беларусі. Па сяўбе ільну—калгаснікі Заходняй вобласьці. Наша сацыялістычнае спаборніцтва ў часе барацьбы за ўборку ўраджаю і выкананьне абавязацельстваў па здачы збожжа дзяржаве праба ўзьняць на яшчэ большую ступень. Апошнія словы тав. Ракітава пакрываюцца гучнымі воплескамі.

Пасьля прыняцьця прывітальных тэлеграм на імя абкому УсеКП(б) Заходняй вобласьці тав. Румянцаву і аблвыканкому тав. Ракітаву, тав. Галадзед выступіў з заключнай прамовай.

Падагульваючы ў кароткіх рысах работу зьезду, тав. Галадзед заклікаў дэлегатаў да шырокай папулярызацыі па станоў зьезду сярод усіх калгасных і працоўных мас Савецкай Беларусі.

— Абавязак кожнага дэлегата,—гаворыць тав. Галадзед,—прыехаўшы на месца, у свой раён, калгас, зараз-жа зрабіць справаздачу аб зьезьдзе. Гэта зьявіцца магутнай мабілізуючай і арганізуючай сілай калгасных і працоўных мас вёскі на барацьбу за пасьпяховую ўборку сацыялістычнага ўраджаю, за датэрміновую здачу с.-г. прадукцыі дзяржаве.

Сваю заключную прамову тав. Галадзед заканчвае словамі:

«НЯХАЙ ЖЫВУЦЬ, МАЦНЕЮЦЬ І БАЛЬШАВІЗУЮЦЦА КАЛГАСЫ БССР І ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦІ. НЯХАЙ ЖЫВЕ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ І ЯЕ ЛЕНІНСКІ ЦК НА ЧАЛЕ З ПРАВАДЫРОМ СУСЬВЕТНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ ТАВ. СТАЛІНЫМ».

У залі — бурныя воплескі і гучнае «ура». Тав. Галадзед абвяшчае другі ўсебеларускі зьезд закрытым.

***

Пасьля закрыцьця зьезду ўсе дэлегаты арганізаванымі парадкам накіраваліся на вакзал для паездкі на палітмасоўку, якая праводзіцца разам з чырвонаармейскімі часьцямі.

НА ЗДЫМКУ: Група членаў прэзыдыуму другога ўсебеларускага зьезду калгаснікаў-ударнікаў. ЗЬЛЕВА НАПРАВА СЯДЗЯЦЬ т. т. ЧАРВЯКОЎ, УБАРЭВІЧ, ГІКАЛО, тав. РУМЯНЦАЎ сакратар Захабкому УсеКП(б), т. ГАЛАДЗЕД, т. РАКІТАЎ (старшыня Захаблвыканкому), СТАЯЦЬ т. т. КАВАЛЬЧУК, АРАНШТАМ ШАРАНГОВІЧ.

Нашы перамогі--вынік ленінскай нацпалітыкі

Старшыні ўраду СССР тав. МОЛАТАВУ В. М.

Кіраўніку Савецкага Саюзу, баявому паплечніку тав. Сталіна—Вячаславу Міхайлавічу Молатаву 2-гі ўсебеларускі зьезд калгаснікаў-ударнікаў шле гарачае прывітаньне.

Зьезд запэўніе ўрад СССР і яго старшыню т. МОЛАТАВА, што пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі калгаснікі Савецкай Беларусі, як і калгасныя масы ўсяго Савецкага саюзу забясьпечаць высокаякасную ўборку і першачарговую тэрміновую здачу сельска-гаспадарчай прадукцыі савецкай дзяржаве, забясьпечаць ажыцьцяўленьне гістарычных указаньняў правадыра партыі—т. СТАЛІНА аб тым, каб зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі, а ўсіх калгаснікаў заможнымі.

Вялізарныя перамогі, якія атрымала рабочая клясa і працоўныя масы БССР зьяўляюцца вынікам правільнага ня ўхільнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, зьяўляюцца вынікам тэй непасрэднай дапамогі, якую ўвесь час аказваў і аказвае Савецкай Беларусі ўрад Савецкага Саюзу.

Няхай жыве наш кіраўнік—партыя бальшавікоў!

Няхай жыве правадыр працоўных усяго сьвету наш СТАЛІН!

Няхай жыве паплечнік тав. СТАЛІНА—Вячаслаў Міхайлавіч МОЛАТАЎ!

Няхай жыве Саюз Савецкіх Сацыялістычных рэспублік!

Здачу збожжа дзяржаве лічым першачарговай задачай

Прывітаньне тав. М. І. КАЛІНІНУ

Гарачае прывітаньне ўсесаюзнаму старасьце тав. КАЛІНІНУ ад дэлегатаў 2-га ўсебеларускага зьезду калгаснікаў-ударнікаў.

Толькі пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, толькі пры ўсямернай дапамозе з боку ўраду Савецкага саюзу магчымы былі тыя вялізарныя перамогі, якія ператварылі Савецкую Беларусь з краіны аграрна адсталай, з краіны культурна занапалай, у краіну індустыяльна-аграрную, у краіну суцэльнай пісьменнасьці.

Ад імя калгаснікаў Савецкай Беларусі мы даем Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту СССР цьвёрдае калгаснае слова заваяваць усесаюзнае першынства ў тэмпах і якасьці ўборкі ўраджаю, у опаборніцтве на першачарговую датэрміновую здачу Савецкай дзяржаве сельска-гаспадарчай прадукцыі. Выкананьне першай запаведзі — «здачу збожжа дзяржаве — мы лічым сваёй першачарговай задачай таму, што наш дабрабыт — дабрабыт кожнага калгасу, калгасніка і працоўнага аднаасобніка — залежыць ад дабрабыту дзяржавы ў цэлым».

Наш баявы сьцяг — гэта барацьба за поўнае ажыцьцяўленьне лёзунгу правадыра партыі тав. СТАЛІНА аб тым, каб зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі, а ўсіх калгаснікаў заможнымі.

Няхай жыве правадыр і арганізатар сацыялістычнага будаўніцтва — ленінская камуністычная партыя!

Няхай жыве правадыр партыі, правадыр працоўных усяго сьвету тав. СТАЛІН!

Няхай жыве усесаюзны стараста тав. КАЛІНІН.

Утрымаем сьцяг пяршынства

ЦК КП(б)Б, тав. ГІКАЛО

Штабу КП(б)Б, кіраўніку пераможнага калгаснага будаўніцтва, кіраўніку посьпяховага правядзеньня сяўбы ў БССР—ЦК партыі бальшавікоў Беларусі на чале з тав. ГІКАЛО—гарачае прывітаньне ад 2-га ўсебеларускага зьезду калгаснікаў-ударнікаў.

Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б пры брацкай дапамозе з боку Савецкага саюзу, пад выпрабаваным кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) на чале з правадыром партыі тав. Сталіным мы з посьпехам закончылі сяўбу, заваяваўшы пяршынства ў сацыялістычным спаборніцтве з калгаснікамі брацкай Заходняй вобласьці.

Пад тым-жа ленінскім кіраўніцтвам, мабілізаваўшы ўсе сілы, ўзорна і датэрмінова закончым уборку і першачарговую здачу сельгаспрадукцыі савецкай дзяржаве.

Ударнымі тэмпамі, высокай якасьцю ўборкі, першачарговай здачай збожжа дзяржаве ўтрымаем сьцяг пяршынства ў спаборніцтве з калгаснікамі Заходняй вобласьці.

Даб'ёмся ажыцьцяўленьня лёзунгу тав. Сталіна—зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі, а ўсіх калгаснікаў заможнымі.

Даб'ёмся, каб першы год другой пяцігодкі быў апошнім годам труднасьцяй.

Няхай жыве ЦК УсеКП(б) на чале з правадыром партыі тав. Сталіным!

Няхай жыве ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало!

Прывітаньне працоўным Заходняй вобласьці

Смаленскаму абкому УсеКП(б)—тав. РУМЯНЦАВУ і аблвыканкому—тав. РАКІТАВУ

Другі ўсебеларускі зьезд калгаснікаў-ударнікаў вітае калгаснікаў і ўсіх працоўных брацкай Заходняй вобласьці.

Таварышы-калгаснікі, калгасьніцы, працоўныя аднаасобнікі Заходняй вобласьці! У барацьбе за выкананьне плянаў веснавой сяўбы на аснове сацыялістычнага дагавору, заключанага першым нашым зьездам калгаснікаў-ударнікаў з калгасамі і калгаснікамі Заходняй вобласьці мы дабіліся пяршынства.

Аднак, мы адсталі ад вас у правядзеньні прапалачных работ і ўздыму папараў. Мы заяўляем вам і **абавязваемся** прыкласьці ўсе сілы на тое, каб нагнаць прапушчанае, каб узорна правесьці ўборку і выканаць датэрмінова свае абавязацельствы перад пралетарскай дзяржавай па загатоўках с.-г. прадукцыі і заваяваць у вас пяршынства.

Мы **заклікаем вас**, калгаснікі, калгасьніцы і працоўныя аднаасобнікі Заходняй вобласьці разам з намі, рука ў руку, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі паказаць узоры высокай працоўнай дысцыпліны ў калгасах, барацьбы з лодырамі, гультаямі, разгільдзяямі. Паказаць узоры ў правядзеньні ўборачнай кампаніі, выканаць першы наш завет — здаць цалкам і поўнасьцю датэрмінова па абавязацельствах збожжа і іншыя с.-г. прадукты дзяржаве.

Дабіўшыся гэтага, мы зробім рашучы крок наперад у справе ажыцьцяўленьня лёзунгу правадыра нашай партыі тав. Сталіна — ператварыць усе калгасы ў бальшавіцкія, зрабіць усіх калгаснікаў заможнымі.

Няхай жыве правадыр нашай партыі, першы наш калгаснік, улюбёны тав. **Сталін!**

Няхай жыве вялікае спаборніцтва калгасаў і калгаснікаў Савецкай Беларусі з калгасамі і калгаснікамі брацкай Заходняй вобласьці!

ПРЭЗЫДЫУМ 2-ГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ.

Дэлегаты зьезду калгасьнікаў-ударнікаў —у чырвонаармейскіх лягерах

Камандаваньне Н-скай кав. дывізіі запрасіла дэлегатаў Усебеларускага зьезду калгаснікаў-ударнікаў наведаць чырвонаармейскія лягеры, паглядзець, як жывуць і працуюць чырвоныя байцы.

Чыгуначнікі для калгаснікаў прадаставілі спэцыяльны цягнік, на якім яны даехалі да лягераў. Дэлегатаў сустракаў ударны эскадрон і дэлегацыя ад ждановіцкага дому адпачынку.

У лягерах адбыўся мітынг, прысьвечаны дню вызваленьня Беларусі ад белаакупантаў. З прывітальным словам ад імя ЦК КП(б)Б і СНК БССР выступіў старшыня Саўнаркому тав. **Галадзед**, ад Менскай партарганізацыі — сакратар Менгаркому тав. **Кудзелька**.

Пасьля мітынгу калгаснікі знаёміліся з баявой вучобай чырвонаармейцаў. Байцы давалі калгаснікам парады, як лепш даглядаць каня, каб ён быў больш працаздольным.

Пасьля гэтага адбыліся скачкі, рубка лазы, заезды, якія былі выкананы з надзвычайнай умеласьцю. У дапаўненьне было паказана, што атрымала Чырвоная армія ў рэзультаце выкананьня першай пяцігодкі — самалёты, танкі.

Дэлегаты яшчэ раз пераканаліся, што на варце іх інтарэсаў стаіць моцная сіла.

НА ЗДЫМКАХ: Зьлева направа: тав. ЧАРВЯКОЎ перадае пераходны Чырвоны сьцяг імя X зьезду Саветаў барысаўскай дэлегацыі, выступленьне старшыні Зах. аблвыканкому тав. РАКІТАВА на зьезьдзе. Тав. ГІКАЛО, сакр. Зах. абкому УсеКП(б) тав. РУМЯНЦАЎ, т. т. УБАРЭВІЧ, ШАРАНГОВІЧ І ЧАРВЯКОЎ ў прэзыдыуме зьезду. Зьверху і ў авапе — прэдстаўнікі Чырвонай армії і чырвоных партызан вітаюць зьезд.



Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

ЗЬЕЗД КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

Выйграем наш галоўны бой
Савету Народных Камісараў БССР —тав. ГАЛАДЗЕДУ

Мы, пасланцы перадавых калгасаў, сабраўшыся на 2 усебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў, шлем прывітаньне савету народных камісараў.

У сёнешні дзень—у 13 гадавіну вызваленьня Беларусі ад белапольскай акупацыі,—мы асабліва са здвальненьнем аглядаем пройдзены намі шлях, шлях упартай барацьбы і вялікіх перамог. Гэтыя перамогі мы атрымалі дзякуючы таму, што зьяўляемся членамі вялікага Савецкага Саюзу, краіны дыктатуры пралетарыяту, краіны, якую вядзе ўперад па шляху сацыялістычнага будаўніцтва слаўная ленінская партыя на чале з любімым правадыром сусьветнага пралетарыяту тав. СТАЛІНЫМ.

Мы з посьпехам вядзем і бязумоўна выйграем наш галоўны бой, які павінен дапамагчы ўсім калгасьнікам выканаць лёзунгі тав. Сталіна—стаць заможнымі. Зарука гэтаму—тыя перамогі, якія мы ўжо атрымалі, зарука гэтаму—наша цьвёрдая воля да новай барацьбы, да новых перамог.

Мы з посьпехам правялі веснавую сяўбу.

Непасрэднае цьвёрдае кіраўніцтва КП(б)Б на чале з тав. Гікало, штодзённае канкрэтнае кіраўніцтва, якое ажыцьцяўляе Савет Народных Камісараў БССР на чале з тав. Галадзедам зьяўляецца зарукай таму, што задачы, якія пастаўлены перад намі партыяй і ўрадам, будуць з гонарам выкананы.

З бальшавіцкай пільнасьцю будзем ахоўваць ураджай калгасных сацыялістычных палёў. Настойліва будзем праводзіць мерапрыемствы па ўздыме ўраджайнасьці і своячасова правядзем уборку ўраджаю.

Першы абмалот здамо дзяржаве, каб датэрмінова выканаць нашу першую запаведзь, выканаць свае абавязкі перад дзяржавай.

Няхай жыве партыя Леніна—арганізатар і правадыр сацыялістычнага будаўніцтва!

Няхай жывуць саветы—органы пралетарскай дыктатуры!

Няхай жыве тав. Галадзед!

МЕНСК, САКРАТАРУ ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО, СТАРШЫНІ ЦВК БССР—тав. ЧАРВЯКОВУ, СТАРШЫНІ САУНАРКОМУ БССР—тав. ГАЛАДЗЕДУ

Рэвалюцыйны вайсковы савет Беларускай ваеннай акругі ад імя байцоў, камандзіраў і палітработнікаў вітае пралетараў, калгасьнікаў і ўсіх працоўных Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ў дзень трыццатай гадавіны вызваленьня Беларусі ад ярма памешчыкаў і капіталістаў. Савецкая Беларусь пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) і правадыра сусьветнага пралетарыяту тав. Сталіна дабілася вялізарных посьпехаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва. Рэвалюцыйны вайсковы савет выказвае цьвёрдую ўпэўненасьць, што пралетары, калгасьнікі Беларусі ў першым годзе другой пяцігодкі з такім-жа посьпехам выканаюць свае абавязацельствы перад пралетарскай дзяржавай на рашаючым зараз участку—уборцы ўраджаю і збожжаздачы. Байцы Беларускай ваеннай акругі за пэўніваюць вас, што яны яшчэ з большай энэргіяй будуць узмацняць баявую магутнасьць Чырвонай арміі, каб у любую мінуту абараніць межы Савецкага Саюзу.

Камандуючы войскамі БВА УБАРЭВІЧ.

Член РВС АРАНШТАМ.

Захаваем ураджай, выканаем свой абавязак перад дзяржавай
Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту БССР—тав. ЧАРВЯКОВУ

Другі ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў, які сабраўся на рашаючым этапе падрыхтоўкі да ўборкі і збожжаздачы дзяржаве, горача вітае Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Савецкай Беларусі.

З вялікай радасьцю наш зьезд адзначае тыя вялізарныя дасягненьні, якія атрыманы БССР на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва пад кіраўніцтвам партыі Леніна. Гэтыя дасягненьні зьяўляюцца вынікам што дзённага ўмацаваньня дыктатуры пралетарыяту, штодзённага ўмацаваньня савецкай улады, вынікам няўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі на шай партыі і правадзімай ёю ленінскай нацыянальнай палітыкі.

З непахіснай воляй да новых перамог мы ўступілі ў першы год другой пяцігодкі, пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Мы з посьпехам правялі веснавую сяўбу.

Зараз на нашых калгасных палёх расьце, красуе, наліваецца новы ўраджай.

Захаваць ураджай, ачысьціць яго ад зельля, падрыхтаваць да ўборкі, каб правесьці яе ў тэрмін і бяз усякіх страт, датэрмінова з першага абмалоту выканаць як першую запаведзь свой абавязак перад дзяржавай—вось баявыя задачы, якія зараз стаяць перад кожным калгасам, перад кожным калгасьнікам, перад кожным працоўным аднаасобнікам.

Гэтыя задачы мы з гонарам выканаем, каб зрабіць калгасы бальшавіцкімі, каб усіх калгасьнікаў зрабіць заможнымі.

Няхай жыве наша ленінская партыя!

Няхай жыве наша Савецкая ўлада!

Няхай жыве лепшы калгасьнік, лепшы чалавек савецкай зямлі—правадыр ленінскай партыі і сусьветнага пралетарыяту т. СТАЛІН!

Няхай жыве старшыня ЦВК БССР т. ЧАРВЯКОЎ!

ГАРБАЧ
калгас „КІМ", Чырвоная Слабада

Летась—4, цяпер—11

Я хачу падзяліцца вопытам работы нашага калгасу. У сярэднім на гаспадарку ў нас прыпадае па 6,5 га пахаці. Тым ня менш абавязкі, узятыя на сябе, калгас выканаў.

Сяўбу мы скончылі **6 мая**. Усе культуры сеялі ачышчаным насеньнем, па ўгноенай глебе. Мы можам спадзявацца значнага ўраджаю. Маркуем атрымаць па **13** цэнтн. жыта, **12** цэнт. пшаніцы, **11** цэнтн. аўса і па **800** пудоў бульбы з кожнага гэктара.

Што мы атрымаем на адзін працадзень?

— 11 кгр. збожжавых культур (летась мелі 4 кгр.) і 22 кгр. бульбы (летась мелі 10 кгр.). Грошай летась атрымалі 1 руб., у гэтым годзе—2 р. 50 к.

Як мы дабіліся гэтага? Вялікую ролю тут адыграў брыгадны мэтад работы, бо кожная брыгада цалкам і поўнасьцю адказвае за ўраджай. У нас ёсьць спэцыяльная камісія, якая разам з прадстаўнікамі ад брыгад кожны вечар прымае работу.

Мы зможам (і гэта абавязкова зробім) усё ўбраць і своячасова здаць дзяржаве с.-г. прадукты па ўстаноўленых нормах з першага да 15 жніўня па ўсіх культурах. Наш калгас «КІМ» бярэ на сябе такі абавязак.

Ва ўсёй нашай рабоце нам значную дапамогу аказвае наш палітаддзел і раённы камітэт партыі. Калгасная падзяка партыі за стварэньне палітаддзелу.

ДРАПЕЗА
калгас „Бальшавік", Парычы

МАЯ—НАША ДАРОГА

Дазвольце мне слова сказаць.

Можа што і няўмелае скажу, дык выбачайце. Першы раз выступаю. Мне ўжо **70** год. Я была ўвесь час батрачкай, працавала на кулакоў і тады я нічога ня мела, нават хлеба ня было.

У 1929 г. уступіла ў калгас **«БАЛЬШАВІК»** і зараз у мяне **ЁСЬЦЬ СВАЯ КАРОВА** і ўжо дзяржаве плян па малоку **ВЫКАНАЛА.** Хатку пабудавала. Летась у мяне адзей было 180 працадзён, я атрымала 20 пудоў збожжа і 80 пудоў бульбы.

Цяпер я пра свой калгас раскажу. У нашым калгасе мы засеялі 100 гэктараў жыта, бульбы—50, лёну—12, ячменю—25, аўса—30, гародаў—6 га і тытуню—5 га.

Праполку мы ўжо скончылі, прапалолі ўсё. Прапалолі чыста, па два разы.

Да ўборкі мы ўжо гатовы. Машыны стаяць спраўнымі, сярпы гатовы. Як толькі пасьпее, мы выйдзем у поле жаць, ды адразу малаціць будзем і ў першую чаргу дзяржаве здамо.

На сенажаці ў нас ужо косяць другі тыдзень 80 касцоў. Скасілі 70 га, толькі вось дожджык быў і ня ўсё ўбралі.

У калгасе ў нас ёсьць 70 сьвіней, 70 парасят, 63 каровы, 60 цялят. Па будавалі добрыя хлявы для кароў, сьвінарнікі з цэмантаванымі падлогамі.

У калгасе жыцьцё наша значна палепшылася, чым было раней, калі

мы жылі на сваіх аднаасобных гаспадарках.

Кулакі прабавалі шкодзіць нам у працы. Кулак думаў усё гэта пераламаць. Не, яны нашай улады не пераламаюць. Калгасы—гэта наша дарожка. Нам тут жыць, і яны нам не накажуць у бок адступіць ад яе. Зьвяр нуць нас з гэтай дарожкі нікому ня ўдасца.

Няхай жыве тав. **СТАЛІН,** няхай жывуць бальшавікі і ўся наша партыя!

Уключаемся ва ўсесаюзны агляд падрыхтоўкі да навучальнага году

КАЛГАСЬНІКІ-ДЭЛЕГАТЫ ЗЬЕЗДУ—У АДКАЗ НА ЗАКЛІК ВАРАШЫЛАУЦАУ

ТАВАРЫШЫ РАБОЧЫЯ-ЎДАРНІКІ І ІТР ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАГА ЗАВОДУ ІМЯ КЛІМА ВАРАШЫЛАВА!

Мы, дэлегаты 2-га ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў ад Рэчыцкага, Парыцкага, Церахаўскага раёнаў прачыталі ваш заклік уключыцца ва ўсесаюзны агляд падрыхтоўкі да новага навучальнага году і зусім з вамі згодны, што, змагаючыся за канчатковую перамогу сацыялізму, нельга ні на хвіліну забываць аб нашых дзецях, аб іх камуністычным выхаваньні і аб іх вучобе.

Вы правільна гаворыце, што работа савецкай палітэхнічнай школы павінна быць прадметам нашай асаблівай увагі, пастаяннай дапамогі ўсіх нас і асаблівае кожнага ўдарніка.

Мы прымаем ваш заклік і, уключаючыся ва ўсесаюзны агляд, абавязваемся па прыезьдзе ў свае калгасы дабіцца неадкладнай мабілізацыі ўсіх калгасьнікаў і працоўных сялян—аднаасобнікаў на баявую сустрэчу «дня вучобы»—1 верасьня.

Мы бярэм на сябе абавязкі праз мабілізацыю калгасных мас, праз мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў:

1. ДА 15-ГА ЖНІЎНЯ ДАПАМАГЧЫ СЕЛЬСАВЕТАМ СКОНЧЫЦЬ РАСПАЧАТАЕ БУДАЎНІЦТВА ШКОЛ І РАМОНТ ШКОЛЬНЫХ ПАМЯШКАНЬНЯЎ У ШКОЛАХ, ДЗЕ НАВУЧАЮЦЦА НАШЫ ДЗЕЦІ.

2. АРГАНІЗАВАЦЬ ЗБОР ПРАДУКТАЎ ХАРЧАВАНЬНЯ І АСАБЛІВА ГА РОДНІНЫ З НОВАГА ЎРАДЖАЮ НА АРГАНІЗАЦЫЮ ГАРАЧЫХ СНЕДАНЬНЯЎ У ВЯСКОВЫХ ШКОЛАХ. Дапамагчы школам убраць ураджай з прышкольных вучасткаў на гэту-ж мэту.

3. Па вашаму прыкладу мы вылучаем у кожным калгасе брыгады з лепшых ударнікаў-калгасьнікаў для сыстэматычнага ўдзелу ў падрыхтоўцы нашых школ да навучальнага году.

4. У АСЕНЬНЮЮ ПАСЕЎНУЮ КАМПАНІЮ АБАВЯЗВАЕМСЯ ЗВЫШ ПЛЯНУ ЗАСЕЯЦЬ У КОЖНЫМ КАЛГАСЕ ПА 1 ГА АЗІМЫХ З ТЫМ, КАБ, РЭАЛІЗАВАЎШЫ ЎРАДЖАЙ, СРОДКІ СКАРЫСТАЦЬ НА ПАЛЯПШЭНЬНЕ МАТАР'ЯЛЬНАГА СТАНОВІШЧА НАШАЙ ШКОЛЫ.

5. ДАПАМАГЧЫ ПРАВЕСЬЦІ ЎЛІК ДЗЯЦЕЙ, забясьпечыўшы 100 проц. ахоп іх школамі і акуратнае наведваньне не заняткаў на працягу ўсяго навучальнага году.

6. ЗАГАТОВІЦЬ І ВЫВЕЗЬЦІ СІЛАМІ КАЛГАСУ АПАЛ ДЛЯ ШКОЛ НА ЎВЕСЬ 1933-34 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД. Гэту работу мы скончым ДА 25 ЖНІЎНЯ.

7. АКАЗВАЦЬ УСЯМЕРНУЮ МАТАР'ЯЛЬНУЮ ДАПАМОГУ НАСТАЎНІКАМ ШКОЛ, ПРЫМАЦАВАНЫМ ДА КАЛГАСАЎ.

8. На старонках нашых насьценгазэт сыстэматычна асьвятляць ход падрыхтоўкі да навучальнага году.

9. ДАПАМАГЧЫ ШКОЛАМ АРГАНІЗАВАЦЬ РАБОЧЫЯ ВАКОІ І АКАЗАЦЬ ПАСТАЯННУЮ СЫСТЭМАТЫЧНУЮ ДАПАМОГУ Ў ПАЛЯПШЭНЬНІ ПАЛІТЭХНІЧНА-ВЫТВОРЧАГА НАВУЧАНЬНЯ.

Мы заклікаем пасьледваць нашаму прыкладу ўсе дэлегацыі 2-га ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў. Разам з тым мы заклікаем калгасьнікаў Заходняй вобласьці, з якімі мы спаборнічаем на лепшае правядзеньне ўборачнай кампаніі, НЕАДКЛАДНА ЎКЛЮЧЫЦЦА ВА ЎСЕСАЮЗНЫ АГЛЯД, абвешчаны УсеЦСПС, Наркамасьветы РСФСР, УССР, БССР, ЦК саюзу працасьветы і рэдакцыяй газэты «За коммунистическое просвещение».

Таварышы калгасьнікі, мабілізуем усе сілы і сродкі на дапамогу нашай савецкай палітэхнічнай школе, мабілізуемся на баявую сустрэчу новага навучальнага году, стварым усе ўмовы для нашых школ і разам з імі будзем змагацца за рэалізацыю гістарычных пастаноў ЦК партыі аб школе, за пераўтварэньне нашых школ у сапраўды палітэхнічныя школы Маркса-Леніна-Сталіна.

НЯХАЙ ЖЫВЕ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ — АРГАНІЗАТАР НАШЫХ ПЕРАМОГ У БУДАЎНІЦТВЕ САЦЫЯЛІЗМУ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕПШЫ ЎДАРНІК-КАЛГАСЬНІК ТАВ. СТАЛІН!

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЦК КП(б)Б НА ЧАЛЕ З ТАВ. ГІКАЛО!

НЯХАЙ ЖЫВЕ БАЯВАЯ СУСТРЭЧА НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ!

ПОДПІС 30 ДЭЛЕГАТАЎ 3-Х РАЁНАЎ.

Дэлегаты слухаюць да клад тав. ШАРАНГОВІЧА.

250 ПРАЦАДЗЁН

РАГАЧОЎ, s.

Калгас імя КАЛІНІНА атрымаў права паслаць свайго дэлегата на другі ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў. Атрымаў заслужана.

Калгас імя Калініна першым у раёне скончыў веснавую сяўбу, выканаўшы плян да 23 мая на 109 проц. Ячмень, пшаніца і авёс засеяны ў праз у пачатку красавіка. Ударная праца ў часе сяўбы прынесла свае рэзультаты. На палёх калгасу выключна добрыя ўсходы. Калгас завяршае сенаўборку і цалкам падрыхтаваў да ўборкі новага ўраджаю. Машыны і інвэнтар адрамантаваны. Да кожнай жнэйкі прыстасаван зерняўсоўнік. Для вазоў загатоўлен брэзент, каб пры возцы снапоў не загінула ні адно зерне. Летась калінінцы былі першымі ў раёне і на другім месцы ў рэспубліцы па здачы збожжа дзяржаве. Зараз калгас абавязаўся поўнасьцю здаць збожжа паводле пляну дзяржаве не пазьней 5-га жніўня, а па іншых культурах — да 1 га верасьня.

На другі ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў калінінцы пасылаюць свайго лепшага калгасьніка-ўдарніка камсамольца **ЯНА ЗАВАДЗКАГА** (сакратар камсамольскай ячэйкі і брыгадзір). Ян едзе на зьезд з працоўнай кніжкай, у якой чырвоным алоўкам адзначана:

«ЗА ШЭСЬЦЬ МЕСЯЦАЎ 1933 ГОДУ ВЫПРАЦАВАЎ 250 ПРАЦАДЗЁН».

СКАРЫСТОЎВАЦЬ СПЭЦЫЯЛІСТАЎ ПА ПРЫЗНАЧЭНЬНІ
(Ліст спэцыяліста)

Я скончыў прафтэхшколу мэталістаў. У 1929 годзе працаваў па мантажы турбін на БелДРЭС'е. Пасьля гэтага быў камандыраван на мантаж турбін у Кузьнецкбуд, дзе кіраваў брыгадай мантажнікаў.

У 1932 годзе я працаваў у мэханічным цэху заводу «Асінторф», адкуль быў накіраван у Менск на курсы ТНВ. На курсах я правучыўся 6 месяцаў і атрымаў кваліфікацыю тэх. нармоўшчыка. Скончыўшы курсы, я вярнуўся 5-га мая зноў на завод «Асінторф», але мяне ўвесь час не скарыстоўваюць па маёй спэцыяльнасьці. Адзін месяц я працаваў у бюро наборных дакуманта ў, пасьля начальнікам агрэгату ў той час, як торфаздабыча мне амаль зусім не знаёма.

Важнейшы ўчастак работы—тэхнар мараваньня на заводзе «Асінторф» ігнаруецца. Яркім доказам гэтага можа служыць перакідваньне мяне з аднэй работы на другую, у той час, як працуючы па сваёй спэцыяльнасьці, я змогчы даць заводу значна больш карысьці, чым даю зараз.

Яловік.

Ад рэдакцыі: Аршанскай РКК-РСІ трэба зацікавіцца пытаньнем скарыстаньня спэцыялістаў на заводзе «Асінторф» ліквідаваць маючае месца нерацыянальнага скарыстаньня спэцыялістаў.

Уважліва адносіцца да патрэб сем'яў чырвонаармейцаў
(Ліст камандзіра)

З 1924 году, па 1932 год я разам з сям'ёй працаваў у калгасе «Новая Жыцьцё», Верхменскага сельсавету (Смалявіцкі раён). У лютым 1932 году я, як камандзір запасу, прызван у рады РСЧА. Пасьля ўходу ў армію ў калгасе засталася мая сям'я ў складзе двух чалавек. Праўленьнем калгасу у прыватнасьці старшынёй, не ўдзяляецца ніякае ўвагі маёй сям'і. Сям'ю пераселілі ў другую кватэру, якая патрабуе капітальнага рамонту. З-за адсутнасьці сродкаў сама сям'я ня можа адрамантаваць кватэры.

Увосень 1932 году, калі прводзіўся рамонт кватэр калгасьнікам, бацька зьвяртаўся да старшыні калгасу з просьбай аб аказаньні дапамогі ў рамонце кватэры. Але ад старшыні атрымаў адказ «табе—у апошнюю чаргу».

У мінулым годзе бацька хварэў і неаднаразова прасіў дазволу ў старшыні калгасу ўзяць каня для паездкі ў бальніцу, апошні каня яму ня даў. У гэты-ж самы час другімі калгасьнікамі коні скарыстоўваліся для розных непатрэбных разьезадаў.

Два разы мной пасылалася заява на імя праўленьня калгасу з просьбай аб аказаньні дапамогі маёй сям'і. Камісар №-скага асобнага стралковага батальёну таксама пасылаў адносіну ў райза, але мер ніякіх ня прынята. Я вымушан быў узяць чатырохдзённы водпуск і выехаць у калгас, каб урэгуляваць усе непаладкі. Старшыня калгасу шмат чаго мне абяцаў, але і да сённешняга дня нічога канкрэтна ня зроблена.

Надбайныя адносіны з боку праўленьня калгасу наглядаюцца ня толькі да маёй сям'і, але і для раду другіх сем'яў чырвонаармейцаў.

РОДАЎ.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» патрабуе ад Смалявіцкай РКК-РСІ прыняцьця тэрміновых мер па ўзмацненьні штодзённых клопатаў праўленьня калгасу «Новае жыцьцё» да сем'яў чырвонаармейцаў. Вінаватыя ў невыкананьні рашэньняў партыі і ўраду аб забесьпячэньні сем'яў чырвонаармейцаў павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Бяз уліку патрэбы
(Ліст дырэктара саўгасу)

У малакопрамтрэсьце і саўгасспабе БССР разьмеркаваньне розных матар'ялаў для саўгасаў праводзіцца ў габінетах. Патрэбы саўгасаў пры разьмеркаваньні ня ўлічваюцца. Гэта ёсьць вынік бясплянавасьці ў рабоце трэсту. Трэст не патрабуе ад саўгасаў заявак аб патрэбнасьці тых ці іншых матар'ялаў. Каб ня быць галаслоўным, у прыклад, я прывяду свой саўгас «Над-Нёман». Ня так даўно на імя саўгасу трэстам занараджана 1 тона коламазі. Паколькі яе ў нашым саўгасе загатоўлена больш як на 2 гады, і таму заяўкі на гэта саўгас не даваў, дык я вымушан быў адмовіцца яе браць.

Замест таго, каб выправіць памылку і накіраваць мазь туды, дзе яна сапраўды патрэбна, бюракраты з трэсту і саўгасспабу ўсё-ж рашылі настоіць на сваім. Тона коламазі завезена зараз на станцыю і трэст катэгарычна цьпанаваў мне выкупіць яе.

Лічу, што гэты «маленькі», яўна бюракратычны факт дае поўны малюнак таго, як разьмяркоўваюцца малакопрамтрэстам і саўгасспабам уборачныя машыны, інвэнтар і рознастайныя матар'ялы для саўгасаў

К.

За дзейснасьць лістоў рабочых і калгасьнікаў
Па сьлядох надрукаваных лістоў

У газэце «Зьвязда» ад 21 чэрвеня гэтага году надрукован ліст начальніка палітаддзелу Стара-Дароскай МТС. У гэтым лісьце тав. Замскі выкрыў рад агіднейшых фактаў, якія дапускаліся паасобнымі адказнымі работнікамі раёну.

Апартуністычная недаацэнка ролі палітаддзелу і тых задач, якія пастаўлены перад імі нашай партыяй, прывяла паасобных кіраўнікоў Стара-Дароскага раёну да яўнага ігнараваньня работнікаў палітаддзелу; ім не давалі права карыстацца сродкамі перасоўваньня, не давалі кватэр і памяшканьня для працы і г. д.

Пасьля надрукаваньня гэтага ліста, бюро Стара-Дароскага РК КП(б)Б выпраўляе свае памылкі.

У паведамленьні рэдакцыі «Зьвязды» па сутнасьці надрукаванага лісту сакратар РК КП(б)Б тав. Цайлінгольд піша, што РК цалкам прызнае меўшыя месца грубыя памылкі ў адносінах да палітаддзелу, бюро РК самакрытычна вырашыла гэта пытаньне, наладзілі ўзаемаадносіны з палітаддзелам, стварыла яму ўмовы для працы, прадаставіўшы кватэры работнікам і памяшканьне для работы самога палітаддзелу.

Разам з гэтым бюро РК КП(б)Б за антыпартыйныя адносіны да палітаддзелу рэдактару райгазэты т. Татуру абвясьціла вымову, вывела яго са складу бюро і пленуму РК зьняла з работы рэдактара. Прыцягнут да партадказнасьці тав. Усьнялоўскі, а таксама зьнят з працы загадчык Камгасу і т. д.

Адначасова, для поўнага і больш глыбокага выпраўленьня памылак, разгорнута работа на ўсёй партарганізацыі на дэталёвай распрацоўцы рашэньня пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб палітаддзелах. Мабілізаваны рад адказных раённых работнікаў у дапамогу рабоце палітаддзелу, мабілізаваны і пасланы на пастаянную работу сакратарамі парт'ячэек на тэрыторыю абслугоўваньня МТС два адказных работнікі і ўжыты рад іншых мерапрыемстваў.

Х. ДУНЕЦ

ПАКОНЧЫЦЬ З ВЯЛІКАДЗЯРЖАЎНІЦКІМІ ТЭНДЭНЦЫЯМІ Ў КІНОПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БССР
(Пра работу кінофабрыкі „Савецкая Беларусь")

У жніўні мінулага году ЦК КП(б)Б разглядаў пытаньне аб рабоце кінофабрыкі «Савецкая Беларусь» і вынес сваю пастанову. Гэта пастанова павінна была стаць асновай усёй работы фабрыкі. У гэтай пастанове ЦК вызначыў далейшыя шляхі работы фабрыкі, паставіў перад ёю ў якасьці цэнтральнай задачы — **паказаць сацыялістычнае будаўніцтва БССР.**

Ці-ж выканала фабрыка дырэктывы ЦК партыі? За пройдзены пэрыяд шмат чаго можна было зрабіць. Аднак, апрача славеснай дэкларацыі, фабрыкай амаль нічога ня зроблена ў сэнсе выкананьня гэтай асноўнай дырэктывы.

У чым-жа справа? Справа мае свае карэньні ў адсутнасьці бальшавіцкай перабудовы кіраўніцтва фабрыкі. Фабрыка знаходзіцца ў воддалі ад пралетарскай грамадзкасьці БССР — яна працуе ў Ленінградзе. Гэта тэрытарыяльная аддаленасьць павінна яшчэ ў большай ступені прымусіць кіраўніцтва фабрыкі і партыйную ячэйку пільна сачыць за ўсякімі адхіленьнямі ад дырэктыў ЦК КП(б)Б, за ўсякімі спробамі сказіць ленінскую нацыянальную палітыку партыі. Гэта павінна было **ўзмацніць пільнасьць супроць выступленьняў вялікадзяржаўніцкіх элемэнтаў,** што мелі месца на фабрыцы, супроць тэндэнцый сепаратызму. **На справе-ж атрымалася зусім адваротнае.**

Вытворчая дзейнасьць фабрыкі «Савецкая Беларусь» красамоўна гаворыць аб тым, што вялікадзяржаўніцтва, якое ідзе рука ў руку з рэпрэсіямі буржуазных уплываў наогул, не атрымала на фабрыцы належнага бальшавіцкага адпору. З выпушчаных за апошні час мастацкіх фільмаў **ні адзін не пабудован па тэматыцы сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР.** Фабрыкай былі зроблены спробы прыцягнуць беларускіх савецкіх пісьменьнікаў, у гэтым сэнсе тое-сёе дасягнута. Аднак, чыста павярхоўны, **фармальны** падыход да пастановы ЦК КП(б)Б прывёў да таго, што тэматыка, якая распрацоўвалася гэтымі пісьменьнікамі, яшчэ ня высунула **асноўнай** праблемы сацыялістычнага будаўніцтва БССР, яшчэ ня дала вырашэньня вузлавых пытаньняў індустрыялізацыі і калектывізацыі БССР, што ва ўсёй шырыні адлюстроўваюць моц ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Сярод работнікаў фабрыкі, якія імкнуцца ў сваёй масе працаваць у духу задач партыі, няма яшчэ правільнага разуменьня патрабаваньняў, што выстаўляюцца перад імі. Ідуць «дыскусіі» наконт таго, што трэба разумець пад задачай «адлюстраваньня сацыялістычнага будаўніцтва БССР». І гэта, замест канкрэтнага вывучэньня жыцьця і работы партыі і рабочай клясы, замест уключэньня ў гаспадарча-палітычнае жыцьцё БССР. Не ажыцьцяўляецца дырэктыва ЦК КП(б)Б і аб сыстэматычных лекцыях на фабрыцы пра будаўніцтва БССР (а ў гэтым віна Белдзяржкіно ня меншая, чым кіраўніцтва фабрыкі). Наколькі недаацэньваецца ўдзел работнікаў фабрыкі ў гаспадарча-палітычным жыцьці БССР — даказвае абураючы факт невыкананьня кіраўніцтвам фабрыкі простай дырэктывы аб **пасылцы сваіх брыгад на веснавую сяўбу гэтага году ў БССР.**

Адсутнасьць бальшавіцкай самакрытыкі — вось той тормаз сапраўднай барацьбы за лінію партыі. Ні адзін з дакумантаў арганізацыі кінофабрыкі не дае разгорнутай і ўсебаковай ацэнкі прарываў фабрыкі. «Гонар мундзіра», дабрадушша, самалюбаваньне і самарэклама, празьмернае выпукленьне дасягненьняў замест бальшавіцкай трывогі за справы фабрыкі—вось, што характарызуе «стыль» работы. Замест барацьбы з рознымі формамі адкрытага і замаскаванага супраціўленьня лініі партыі, на фабрыцы прадастаўляюць вольна «гуляць» рознага роду буржуазным і дробна-буржуазным «аргументам», накшталт таго, што «мы ня можам папраўляць аўтара і рэжысэра, бо гэта-ж будзе мэханічным урываньнем у спэцыфіку майстэрства» і г. д. Работнікі фабрыкі спрылі сэпаратыскай адарванасьці ад БССР, тэй бясспрынцыповай мітусьнёй, якая вялася і вядзецца супроць Белдзяржкіно. Гэта мітусьня абэктыўна магла мець толькі адну тэндэнцыю: **апраўдаць вялікадзяржаўніцкія настроі,** апраўдаць адарванасьць ад беларускай пралетарскай грамадзкасьці.

Ці вялася на фабрыцы барацьба за «савецкую капейку»? Зусім незадавальняючая. Аб разьмерах выдаткаў фабрыкі сьведчыць хоць-бы той факт, што **адзін кіно-фільм у сярэднім абыходзіцца ў 200—300 тысяч рублёў.** Каштарыс фабрыкі складае суму ў **3.600.000 руб.** Здавалася-б, што тут трэба было мабілізаваць усю грамадзкасьць на барацьбу за эканомію. На справе-ж зусім адваротнае: вялізарныя перавыдаткі, перараздымкі, адсутнасьць барацьбы за захаваньне востра-дэфіцытнай плёнкі, разбуханьне штату і г. д.

Фабрыка атрымала некалькі работнікаў з БССР. Апошнія патрабуюць павышэньня кваліфікацыі, штодзённай дапамогі і кансультацыі. На справе-ж гэтыя людзі **па-заўвагай,** іх не прымацавалі да кваліфікаваных спэцыялістаў і рэжысэраў, яны знаходзяцца ў цяжкіх матар'яльна-бытавых умовах.

На фабрыцы нам прышлося азнаёміцца з «кухняй» вытворчасьці і спэцыярным партфэлем. Зараз там праводзіцца праца над 3-ма мастацкімі карцінамі: «Двойчы народжаныя», «Паручык Кіжэ», «Першае каханьне». Прагледзіць кавалкі фільму «Двойчы народжаныя» (сцэнары Кобеца) нам ня ўдалося (Мастацкая брыгада рабіла здымкі ў ваколіцах Менску). Але выявілася, што праробленая работа і здымкі на Каўказе, якія каштавалі дзесяткі тысяч рублёў — загінулі, як кажуць, у нябыт. Сцэнары быў на-нова пераапрацован і брыгада **на-нова** пачала сваю работу...

Мы прагледзелі кавалкі фільму «Паручык Кіжэ» і «Першае каханьне». Нельга адмовіць у здольнасьцях сцэнарыстам, рэжысэрам і аператарам гэтых фільмаў. Але якая тэматыка? «Паручык Кіжэ» сваім тэматычным стрыжнем бярэ анэкдот з часоў Паўла I. Фільм «Першае каханьне» робіць вылазку ў буржуазны сьвет і малое момант рабочага рэвалюцыйнага руху ў капіталістычным сьвеце. **Абодвы фільмы абыходзяць канкрэтную актуальную тэматыку сацыялістычнага будаўніцтва.** Трэба проста сказаць, што і ў 1933 годзе БССР ад сваёй фабрыкі не атрымае мастацкага фільму аб барацьбе за сацыялізм, бо пазат «Двойчы народжаныя» Кобеца, хоць і пабудаваны па востра-актуальнай тэме (барацьба за каня ў калгасе), у дужа слабой ступені дасягне сваёй мэты.

Што датычыць сцэнарных заготовак, скажам коратка: ёсьць у партфэлі фабрыкі шмат чаго малавартага і другараднага, крыху ёсьць і такога, што можа быць прыстасавана да нашых запатрабаваньняў, але вялікай тэмы, цэнтральнага сцэнарыя няма. Такая мізэрнасьць у «загатоўках» павінна **выклікаць трывогу.**

Вялікая доля прарыву ў сцэнарнай справе зноў такі бярэ карэньні ў замкнутасьці, у адарванасьці фабрыкі ад беларускай пралетарскай грамадзкасьці. Ня было да гэтага часу як сыстэмы, абмеркаваньня сцэнарыеў кіно-фабрыкі сярод рабочых і пісьменьнікаў БССР. Не практыкавалася (а гэта-ж элемэнтарнае патрабаваньне) абмеркаваньне і зацьверджаньне сцэнарыеў у кіруючых арганізацыях БССР. Характэрна, што сьпешнае работы над першым варыянтам сцэнарыя «Двойчы народжаныя», які меў яўна шкодную ўстаноўку, адбылося ня ў выніку абмеркаваньня яго і праверкі, **а на** падставе галоўлітаўскай рэзалюцыі пры прагледзе фрагмэнтаў гэтага сцэнарыя для друку. Да рэчы, сцэнары «Двойчы народжаныя» ў апошнім сваім варыянце таксама быў пушчан у вытворчасьць без праверкі і санкцыі адпаведных органаў і асоб, і ў Наркамасьветы гэты сцэнары трапіў толькі пасьля асабістай просьбы... Ня дзіўна, чаму гэты сцэнары і зараз яшчэ мае вялікія недахопы.

Пару слоў трэба сказаць пра кіраўніцтва кіно-фабрыкай «Савецкая Беларусь» з боку Белдзяржкіно. Апошняе не наладзіла дагэтуль жывога апэрацыйнага кіраўніцтва фабрыкай. Кіраўнікі і работнікі Белдзяржкіно больш «рыцелі пер'ямі», чым сядзелі на самой фабрыцы. Ня былі наладжаны ўзорная кансультацыя, праверка і ацэнка сцэнарыяў і фільмаў, якія выпускаюцца. Трэст у сваю чаргу ня здолеў устаяць супроць элемэнтаў бяспрынцыповай барацьбы і вельмі часта яго кіраўнікі самі ўцягваліся ў бой «за гонар мундзіру», замест канкрэтнай работы.

Кіраўніцтва фабрыкі «Савецкая Беларусь» ня справілася са сваімі задачамі. Яно не вяло барацьбы супроць вялікадзяржаўніцкіх тэндэнцый. Яўна лібэралізм быў праяўлен і ў адносінах да мясцовага беларускага і яўрэйскага шавінізмаў.

Пры такім становішчы рэчаў ня дзіўна, што ўся ўвага аддаецца рабоце вакол фільму «Паручык Кіжэ». Мы не адмаўляем работу над гістарычнай тэматыкай, над «клясыкай», наколькі яны прабуюць паказаць крытычна тую або іншую гістарычную эпоху. Выходзячы з гэтага мы не адмаўляем наогул карыснасьці фільмаў, накшталт «Паручыка Кіжэ». Але ці не за кошт сучаснай тэматыкі вы захапляецеся «Паручыкам Кіжэ», таварышы з кіно-фабрыкі?

***

Было-б няправільным тлумачыць становішча калектыву на кіно-фабрыцы «Савецкая Беларусь», як безнадзейнае. Маса работнікаў фабрыкі, де лепшае творчае ядро імкнецца апраўдаць назву савецкіх кіно-работнікаў. За г

Першая запаведзь—выкананьне плану збожжаздачы

Вышэй рэвалюцыйную пільнасьць да манэўраў клясавага ворага, накіраваных на зрыў цьвёрдых паставак

ЗАКОН АБ ПАСТАЎКАХ—ЦЬВЁРДЫ І НЕПАХІСНЫ

Уся краіна саветаў рыхтуецца да збору новага ўраджаю. Пасвойму «рыхтуюцца» да ўборкі і здачы прадукцыі дзяржаве клясава-варожыя элементы. Кулацтва ўсімі спосабамі імкнецца сарваць цьвёрдыя паставкі, добра ведаючы, што пасьпяховае правядзеньне іх яшчэ больш узмоцніць магутнасьць і абароназдольнасьць Савецкага Саюзу.

Адным з манэўраў кулацтва зьяўляецца распальваньне рвацкіх тэндэнцый у саўгасах і калгасах, агітацыя супроць закону аб цьвёрдай паставцы. Клясазы вораг імкнецца ПАСЕЯЦЬ НЯВЕР'Е Ў НЕПАХІСНАСЬЦЬ УСТАНОЎЛЕНЫХ НОРМ паставак збожжа і бульбы дзяржаве, у непахіснасьць самага закону.

Мы маем факты, калі некаторыя праўленьні калгасаў, некаторыя аднаасобныя гаспадаркі пад уплывам кулацтва давалі хлусьлівыя, яўна зьменшаныя даныя аб ураджаі ў мэтах ашуканьня дзяржавы. Некаторыя калгасы, якія абслугоўваюцца МТС, даюць перапаменшаныя лічбы ўраджаю, каб менш натурпляты здаць МТС. Яркім прыкладам зьяўляюцца факты, якія прыводзяцца ў нарэпандэнцыі з Гамелю, зьмешчанай сёньня ў газэце.

Гэтыя антыдзяржаўныя тэндэнцыі ярка адлюстроўваюць супраціўленьне адміраючых капіталістычных элемэнтаў важнейшым мерапрыемствам партыі і ўраду на вёсцы.

Гэтыя жульніцкія махінацыі павінны быць выкрыты і ліквідаваны ў корані. Партыя і ўрад ня будуць цацкацца з ашуканцамі, кулацкімі агентамі.

Кожны сьвядомы калгасьнік і аднаасобнік павінен зразумець, што закон аб пастаўках збожжа і бульбы дзяржаве—цьвёрды і непахісны. САВЕЦКАЯ ЎЛАДА БУДЗЕ РАШУЧА ЗМАГАЦЦА СУПРОЦЬ УСІХ ПАРУШАЛЬНІКАЎ ЗАКОНУ, ЦІ ТО САВЕЦКІЯ І ПАРТЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, ЯКІЯ ПАПРАБУЮЦЬ ВЫСУНУЦЬ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН І ПАВЯЛІЧЫЦЬ НОРМЫ ЗДАЧЫ, ЦІ ТО КАЛГАСЫ І КАЛГАСЬНІКІ І АДНААСОБНІКІ, ЯКІЯ ПАПРАБУЮЦЬ УХІЛІЦЦА АД ПЕРШАЧАРГОВАГА ВЫКАНАНЬНЯ СВАІХ АБАВЯЗКАЎ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ.

Кулацкія агенты і буржуазныя перадраджэнцы, праўшы ў апараты саўгасных трастаў, земорганаў, імкнуцца арганізаваць сабатаж цьвёрдых паставак і утаіць збожжа ад дзяржавы. Аб гэтым сьведчаць ашуканчыя махінацыі Гомельскага гарза, які штампаваў хлусьлівыя весткі аб ураджайнасьці калгасаў. Хіба не зладзействам, раскрадваньнем збожжа зьяўляюцца спробы некаторых саўгасаў БССР зьнізіць сапраўдныя разьмеры ўраджайнасьці, каб менш прадукцыі здаць дзяржаве. Аб гэтых саўгасах выразна гаворыцца у пастанове ЦК КП(б)Б аб фактах перапамяншэньня ўраджайнасьці.

Справа гонару кожнага рабочага саўгасу, кожнага сумленнага калгасьніка—аднаасобніка выкрываць кулацкія манэўры разьбіваць іх. Ніякай літасьці жулікам і зладзеям, клясавым ворагам.

АШУКАНСКІЯ МАХІНАЦЫІ ГОМЕЛЬСКАГА ЗЕМАДДЗЕЛУ

Гомель (Наш спэц. кар.).

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб фактах ашуканьня дзяржавы шляхам перапамяншэньня ўраджайнасьці, апублікаванай у «Зьвязьдзе» за 3-е ліпеня, сыгналізаваў кіраўніцтву Гомельскага раёну аб праявах у раёне антыдзяржаўных тэндэнцый. Да апублікаваньня гэтай пастановы ў раёне ня ведалі, што творыцца на мясцох, ня ведалі пра кулацкую арытмэтыку, якая практыкавалася ў гарза. А «арытмэтыка» гэта вельмі навучальная. Яна паказвае, што частка старшынь сельсаветаў і праўленьняў калгасаў, апынуўшыся ў палоне кулацкіх уплываў, стала на шлях ашуканьня дзяржавы, сьвядома паказваючы яўна зьменшаныя лічбы ўраджайнасьці. Гэтыя лічбы гарза спісвойна прымаў да ведама.

На 15-е чэрвеня ў гомельскі земаддзел паступілі паступныя весткі ад сельсаветаў і калгасаў:

Па аднаасобным сэктарам—Клімаўскі сельсавет—жыта 4 цэнт. з га, бульбы—80, Зябраўскі—аднаведна—4, 6 і 97, 5, Цярэшкаўскі—4, і 50, Прыбыткаўскі—5, і 80 цэнт. і г. д.; па калгасах МТС — па «Чырвонай Зорцы» № 2—3, 2 цэнтн. жыта, па «Чырвоным Пуцілаўцы» — 3,0, па «Новым жыцьці» — 4,5, па калгасу «Перамога № 2»—3,0, па калгасу—«Совка» № 2—3, 2 цэнтн. жыта з га.

Як-жа аднесьліся работнікі Земаддзелу да гэтых ашуканскіх лічбаў? Ці праверылі яны на мясцох, ці сыгналізавалі перад райкомам аб тым, што трэба рашуча ўдарыць па спробах ашукаць дзяржаву. Не!, кіраўнікі гарза нічога «асаблівага» не знайшлі ў гэтых лічбах, у лепшым выпадку яны прасілі «пераглядзець» весткі.

«Ды што ты, браток! Хіба-ж так сёлета не ўраджыла»,—запыталіся работнікі гарза у прыпоўнага туды з весткамі старшыню калгасу «Варашылаўскі суботнік».

Падзяніліся, патаргаваліся і, нарэшце, ўгаварылі старшыню ўнесьці папраўкі ў зводку. І вось праз дзьве-тры тадзіны ў калгасе «Варашылаўскі суботнік» адзін га аўсу дае ўжо не 3, 5 цэнт. а 6, а бульба—замест 43 цэнт.—32, 7. У калгасе імя Лапцуцкага пасьля выпраўленьня апрымаліся такія лічбы: па аўсу замест 4—6, 8 цэнт., па ячменю замест 5—7 цэнт., ураджайнасьць бульбы з 40 цэнт. зьменшылася да 37. А праўленьне калгасу імя Горкага выправіла нормы ўраджайнасьці ў бок яшчэ большага зьмяншэньня лічбаў на асноўных культурах.

Загадчык Гарза **Грабузоў** і яго намесьнік **Фёдараў** прымалі за чыстую манету гэтыя кулацкія махінацыі, дзе-ні-дзе папраўлялі, «удасканальвалі» лічбы, прыкінуўшы па цэнтнэру, і вывелі сярэднюю лічбу ўраджайнасьці па раёне: жыта—па калгасах 7, 5 цэнт., па аднаасобным сэктарам—7, 9, аўсу—па калгасах 6, 8 цэнт., па аднаасобным сэктарам—6,9. Гэтыя весткі з яўна праўменшанымі паказальнікамі ўраджайнасьці без ведама гаркому і гарсавету пасланы ў цэнтральныя органы.

Такая работа земаддзелу фактычна дапамагае рвачам і ашуканцам, дыскрэдытуе калгасы, па якіх паказана меншая ўраджайнасьць, чым у аднаасобнікаў.

Каб пераканацца ў поўнай хлусьлівасьці гэтых вестак, досыць паглядзець на калгасныя палі, якія шумяць густой зелянінай і квітнеюць надзвычай добрымі ўсходамі. Калгасы Гомельшчыны сёлета з посьпехам правялі веснавую сяўбу, добра апрацавалі глебу, зразумела, ураджай павінен быць значна лепшым, чым летась. Не бачыць гэтага могуць толькі сьляпыя, або людзі, якія ідуць на повадзе ў кулака.

Гомельскі гарком КП(б)Б зараз вылучыў камісію для дэталёвага азнаямленьня з фактамі ашуканства дзяржавы і прыцягненьня вінаватых да суровай адказнасьці. Загадчык земаддзелу Грабузоў пастановай гаркому зьняты з работы.

Я. Івашын.

КУЛАЦКІЯ АГЕНТЫ ЗА РАБОТАЙ...

ЕЛЬСК. (Наш кар.)

Падрыхтоўка да цьвёрдых паставак праходзіць па раёне нездавальняюча. Дагэтуль ня скончана перадача абавязацельстваў калгасам і аднаасобнікам па збожжы і бульбе. Рэмізаўскі, Крамянскі і Качышчанскі сельсаветы яшчэ не перадалі сялянам усіх абавязацельстваў па бульбе, ня гледзячы на тое, што абавязацельствы даўно высланы з раённага цэнтру.

Можна прывесьці рад прыкладаў кулацкага ўплыву на пасасобныя зьвены нізавога апарату. У Санюкоўскім сельсавеце цьвёрдазаданьнікі атрымалі меншыя пляны, чым аднаасобнікі.

Прозыдыум Каменскага сельсавету пастанавіў зьнізіць цьвёрдазаданьніку Браткоўскаму пасеўны плян з 2 га да 1, каб тым самым зьменшыць норму здачы.

Санюкоўскі сельсавет зьвярнуў назад 9 абавязацельстваў, заявіўшы, што аднаасобнікі, якім не пераданы абавязацельствы, працуюць у саўгасе. Пры праверцы аказалася, што гэта яўная хлусьня. Сянюкоўскі, Ельскі, Скарадзінскі сельсаветы перадалі абавязацельствы без расьпісак, яны нават не складалі акты аб адмаўленьні ў прыняцьці абавязацельстваў.

Зусім ігнаруюцца неабагуленыя пасевы калгасьнікаў як па збожжы, так і па бульбе. Дагэтуль толькі 4 сельсаветы з 14 прыслалі РВК сьпісы калгасьнікаў, якія маюць неабагуленыя пасевы.

Слаба рыхтуецца да збожжаздачы Мазырская міжраённая кантора загатзбожжа. Непадрыхтаваны кадры прыёмшчыкаў, ня скончан рамонт складаў, яшчэ не гатова тара.

У раёне можна пачуць апартуністычныя разважаньні аб тым, што «вось скончым поліва, рэалізацыю пазыкі і леса-вывазку, а потым возьмемся за падрыхтоўку да цьвёрдых паставак». Гэтыя шкодныя тэорыі чарговасьці кампаній павінны быць неадкладна ліквідаваны.

Катлярскі.

У 2--3 РАЗЫ МЕНШ НОРМЫ

БУДА-КАШАЛЕВА (ад наш. кар.).

У радзе калгасаў раёну назіраюцца анты-дзяржаўныя тэндэнцыі, спробы ўтаіць сапраўдную ўраджайнасьць каб зьменшыць натураплату МТС.

У калгасе «Пралетары», Кашалёўскага сельсавету праўленьне паказала ўраджай жыта ў 3 цэнтн., а яшчэ ніцы у 4 цэнтн. з га. Гэта ў той час, калі самі калгасьнікі адзначаюць ураджай у 9-10 цэнтн. жыта і 10-11 цэнтн. пшаніцы з кожнага гектара.

Такія-ж спробы ашукаць дзяржаву маюць месца і ў калгасах «Чырвоны гарадок» і імя Варашылава.

Усё гэта магло здарыцца толькі таму, што парт'ячэйкі, сельсаветы і аграномы МТС не зварочваюць увагі на ўлік будучага ўраджаю.

Райземаддзел таксама не рэагуе на манэўры клясавага ворага.

ЛЯВОНЕНКА.



Магнітагорскі мэталюргічны камбінат пасьпяхова спраўляецца з задачамі пастаўленымі перад ім партыяй і ўрадам. Адна за другой уступаюць у строй домны гіганту. НА ЗДЫМКУ: Будоўля 4-ай домны.

Забясьпечыць выкананьне фінпляну 3-га кварталу

У спэцыяльнай пастанове калегіі НКФ адзначаецца, што фінансавыя органы БССР, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і ўраду БССР, пры дапамозе саветаў, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый дабіліся вялікіх перамог на фінансавым фронце. Плян мабілізацыі сродкаў за першае паўгодзьдзе 1931 г. выкананы на 100,4 проц., а плацяжы з аграмаджанага сак тару складаюць 103,3 проц.

Выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў другога кварталу раўнецца 102,4 проц., а па дабраахвотных плацяжох 105,8 проц. 39 раёнаў перавыканалі свае квартальныя пляны мабілізацыі сродкаў, а 27—па плацяжох аграмаджанага сэктару.

Да перадавікоў у выкананьні фінпляну трэба аднесьці **Заслаўскі, Асьвейскі, Старобінскі, Касьцюковіцкі, Чырвона-Слабодзкі, Вузьдзенскі, Жыткавіцкі, Тураўскі, Менскі, Гомельскі, Рагачоўскі, Чэрвеньскі і Лагойскі** раёны. За іх ударную работу калегія Наркамфіну пастанавіла перавесьці ў разпараджэньне гарфа або райфа на прэміяваньне лепшых фінударнікаў і паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў работнікаў фінансава-крэдытнага апарату наступныя сумы: Менскаму і Гомельскаму раёнам па 2.000 руб. кожна му, а ўсім раней пералічаным па 1.500 руб.

У першы раз за два гады **Барысаўскі, Бярэзінскі, Бялыніцкі, Кармянскі і Чырвонапольскі** раёны выканалі свае квартальныя пляны. За гэта яны зьня ты з чорнай дошкі і прэміруюцца па 1.000 руб.

Але побач з гэтым не ліквідаваны яшчэ рад недахопаў у фінансавай рабоце. Так, вялікае недавыкананьне (на 15 проц.) ёсьць па ўкладах у ашчадкасы. Збор паёў спажыўкаапэрацыі складае толькі 86,1 проц., а аварот сельска-гаспадарчых пазык — 82,3 проц.

Уваравіцкі, Ветка ўскі, Клічаўскі, Сураскі, Бешанковіцкі Церахаўскі, Талачынскі, Рэчыцкі, Парыцкі, Асіпавіцкі раёны не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з пастаўленымі перад імі задачамі, не разгарнулі шырокай масавай работы і плян мабілізацыі сродкаў фактычна сарвалі.

Зразумела, што з чорнай дошкі яны зараз не зьнімаюцца, а загадчыкі райфа павінны арабіць рашучыя захады для таго, каб забясьпечыць выкананьне пляну трэцяга кварталу, бо інакш да іх будуць прыняты самыя суровыя меры адміністрацыйнага пакараньня і фінансавых рэпрэсій.

Плян трэцяга кварталу складаецца ў асноўным з сельскіх плацяжоў (сельгаспадатак, самаабкладаньне, страхоўка, пазыка другой пяцігодкі). Гэта высоўвае перад райфа і гарфа на бліжэйшы час задачы: па-першае, дабіцца поўнай рэалізацыі пазыкі, асабліва ся род аднаасобнікаў і, па-другое, правесьці ці ўлік усіх аб'ектаў абкладаньня сельгаспадаткам і своячасова правесьці абкладаньне ва ўсіх населеных пунктах.

У гэтай рабоце трэба быць асабліва пільным, каб не дапусьціць скажэньняў клясавай лініі і парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці.

Хутчэй перабудоўваць работу чыгуначнага транспарту

ВІЦЕБСК. (Наш кар.).

Работа Віцебскага чыгуначнага вузла (6-ты эксплёатацыйны раён) — лепшы доказ своячасовасьці пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб чыгуначным транспарце. Вузел, як і ўвесь 6-ты раён, мае значныя недахопы ў рабоце. Гэта пацьвярджаецца лічбамі выкананьня трафіпляну за чэрвень.

Процант хворых паравозаў значна вышэй нормы. Паводле заданьня, лік іх да агульнага рабочага парку не павінен перавышаць 18, 15 проц., а фактычна за чэрвень было 14,03 проц. На тарачай прамыўцы кожны паравоз у сярэднім павінен прастойваць ня больш 10 гадзін, між тым прастой складае 10,8 гадзін. Яшчэ горш з халоднай прамыўкай. Тут паравоз прастойвае замест 42 гадзіны па пляну—55,8.

Асабліва нізкая якасьць рамонту паравозаў. Калі ў маі паўторнасьцяй было 47, дык толькі за дзьве дэкады чэрвеня іх было ўжо 46. Значна павялічыліся выпадкі пошкаджэньня паравозаў у дарозе (у маі было 6, у чэрвені 11).

Спаранная ізда сыстэматычна зрываецца. Даволі сказаць, што за адзін чэрвень было 389 зрываў. Вось некаторыя канкрэтныя вінаватыя ў парушэньнях спаранай ізды: машыніст **Радзішэўскі**, памочнікі машыністаў **Філіпенка, Кабіс, Цыбульскі, Ярэшчэнка, качагары Шаўроў, Сарокін, Дзьмітрыеў, Драздоў** і інш.

Не наладжана і работа вагоннага парку. На працягу мая і чэрвеня было 1.253 выпадкі адцэпкі вагонаў у дарозе з прычыны гарэньня буксаў. Гэта сьведчыць аб дрэннай якасьці рамонту, аб нядбайным доглядзе вагонаў у дарозе і засьмечанасьці клясава-варожымі элемэнтамі змазчыкаў. У чэрвені выпадкі адчэпак значна павялічыліся. Калі ў маі было 610 выпадкаў адчэпак, дык у чэрвені — 642. Начальнік вагоннага дэпо тав. **Красікаў** замест таго, каб прыняць рашучыя меры па ўзадраўленьні вагоннага парку, пайшоў на шлях простага «очковтирательства». З мэтай паказаць у вестках меншы процант хворых вагонаў, ён не рамантаваў іх у сваім дэпо, а накіраваў у рамонтныя пункты іншых станцый. Так, 26-га мая ён з Віцебску ў Нова-Сакольнікі адправіў 33 хворыя вагоны, 28 мая — 26 вагонаў і 6 чэрвеня ў Полацак 45 вагонаў.

Сыстэматычна зрываецца графік сьледваньня пасажырскіх і таварных цягнікоў. У чэрвені заданьне па сьледваньні таварных цягнікоў выканана на 90,3 проц.,—нават менш, чым у маі. Задань не па сьледваньні пасажырскіх цягнікоў за першую дэкаду чэрвеня выканана на 86 проц., за другую—92, і трэцюю —88 проц. Прастой цягнікоў у дарозе—частыя зьявішчы. 4 ліпеня цягнік № 743 прастаяў на пасту 425-га кілёмэтру 20 мінут толькі з прычыны таго, што сыгналіст **Крэнка**... спаў і не адкрыў семафору.

Нізкая працоўная дысцыпліна, нядбайныя адносны да сваіх службовых абавязкаў параджаюць вялізарную колькасьць здарэньняў. У чэрвені было 106 здарэньняў, большасьць з іх па віне машыністаў і дзяжурных па станцыі. Вось некалькі прыкладаў. 25 чэрвеня ў выніку таго, што сыгналіст **Апяшкоўскі** няправільна перавёў стрэлку, паравоз зышоў з рэек. Уноч з 1 на 2 ліпеня составіцель **Дабіжа** пусьціў вагон на маёўровы састаў, у выніку разьбіт вагон і цыстэрна.

Ураўнілаўка — гэты заядлы вораг прамфінпляну, укаранілася ва ўсе зьвёны чыгуначнага транспарту 6-га раёну. Тэхнік пры кіраўніцтве аддзелу цягі атрымлівае 190 руб. у месяц, а тых нік, які працуе непасрэдна на вытворчасьці — 180 руб. Загадчык дзеладзтва пры гэтым-жа аддзеле, які займаецца выключна папіровай перапіскай, атрымлівае ў месяц 128 руб., у той час, як машыніст пастаяннай установкі — 111 руб. Месячная пэнсія канторшчыка канцылярыі раённага кіраўніцтва—176 руб., а змазчыка цягнікоў — 67 руб. Сьлесары 7-га разраду атрымліваюць аднолькава па 1 руб. 18 кап. за гадзіну, незалежна ад характара работы, якую яны выконваюць. Між тым, розьніца паміж іх работай значная. Калі сьлесар-арматуршчык 7 разраду павінен ведаць усю ўнутраную пабудову паравоза, усе яго састаўныя часткі, выконвае складаную работу, дык сьлесар тормазных калодак, таго-ж самага разраду, выконвае толькі вузкі аб'ём работы — тормазныя калодкі.

Простай карыкатурай на сыстэму аплаты зьяўляецца той факт, што кацельшчык гарачага цэху зарабляе адфолькава (1 руб. 05 кап. за гадзіну работы), як і пячнік. Начальнік дыстанцыі, які адказвае за становішча ўсёй дыстанцыі, атрымлівае 263 р. у месяц, а эканаміст—300 руб. і г. д.

Адставаньне Віцебскага чыгуначнага вузла ёсьць рэзультат канцылярска-бюракратычных мэтадаў кіраўніцтва. Замест жывога практычнага кіраўніцтва непасрэдна на вытворчасьці людзі займаюцца папяровай пісаніной. Даволі ўказаць на тое, што штат раённага кіраўніцтва складаў 265 чалавек, жыве толькі і ведалі дырэктывы даваць. У стататдзеле працуе 15 чалавек, якія не рэпісваюць статыстычныя зводкі розных аддзелаў і пададдзелаў, дзе, у сваю чаргу, ёсьць не малая колькасьць статыстаў. Характэрна, што выключна на гэтай статыстычнай рабоце сядзяць нават інжынэры і тэхнікі-эксплёатацыйнікі (інжынэр **Гурэвіч**, тэхнік **Герасіменка**). Ня дзіва таму, што з агульнага ліку 13-ці інжынэраў і 51 тэхніка працуюць на вытворчасьці ўсяго толькі тры інжынэры і 14 тэхнікаў.

Чыстка партыі, якая зараз праходзіць на вузле, выклікала творчы ўздым і энтузіязм рабочых. У першыя дні чыстки арганізавана 36 новых ударных брыгад. Брыгады паказваюць узоры барацьбы за выкананьне прамфінпляну. Саставіцельная брыгада на чале з беспартыйным ударнікам **Мігіцкім** выконвае сваю норму выпрацоўкі на 129 проц. Кандуктарская брыгада камуністаў **Ганчарова** поўнасьцю спраўляецца з сваім заданьнем па сьледваньні таварных цягнікоў па раскладу. Брыгада саставіцеляў цягнікоў **Барабанава і Маслакова** выконваюць заданьне на 115 проц., брыгада **грузчыкаў Лісоўскага, Шапая і Воўкава**—на 123-155 проц.

За час чыстки значна палепшылася работа станцыі. За пяць дзён ліпеня простой транзітных вагонаў пры задань ні ў 8,8 гадзін, складае 6,4 гадзіны.

Прыкладную работу паказвае 31-ая дыстанцыя шляху, якой кіруе тав. **Джумок.** Рабочыя гэтай дыстанцыі выканалі датэрмінова — за два дні раней тэрміну—плян другога кварталу рамонту шляху.

У дзень атрыманьня пастановы СНК і ЦК УсеКП(б) аб чыгуначным транспарце ў 10 гадзін раніцы была склікана нашыраная нарада партыйцаў і прафсаюзнага актыву вузла. Дэтальна прапрацавалі пастанову. У 12 гадзін дня яна ўжо абмяркоўвалася на ўсіх вытворчых зьвёньнях вузла. Рабочыя чыгуначнікі, інжынэрна-тэхнічны персанал аднадушна ўхвалілі пастанову СНК і ЦК.

Інжынэр—старшыня РБІТС тав. **Міна** заявіў: інжынэрна-тэхнічныя работнікі да гэтага часу сядзелі ў кіраўніцтве раёну, занятыя канцылярыйчнай, адарваныя ад жывой справы. Пастановай СНК і ЦК яны зараз вызваляюцца ад паперы. З радасьцю і энтузіязмам пойдзем працаваць у дэпо, у нізавое зьвяно, панясем туды з сабой тэхніку, каб работу службы цягі і ўсяго транспарту ўзьняць на ўзровень задач другой пяцігодкі.

Інжынэр-плянавік тав. **Герасіменка** ў сваёй прамове сказаў: горача вітаю пастанову партыі і ўраду, лічу, што зараз буду мець поўную магчымасьць скарыстаць цалкам і поўнасьцю атрыманыя мною ў вышэйшай навучальнай установе веды для ўзмацненьня чыгуначнага транспарту.

У адказ на пастанову СНК і ЦК паравозьнікі абвясьцілі ўнутрыдэпоўскі конкурс на лепшага машыніста і рамонтную брыгаду. Эксплёатацыйнікі так сама абвясьцілі конкурс на лепшага саставіцеля і зьмену, на лепшага кандуктара, і кандуктарскую брыгаду, лепшага вагаўшчыка і грузчыка. Адначасова яны выклікалі на спаборніцтва паравозьнікаў і эксплёатацыйнікаў станцыі Ворша і ўзьявілі халадніцтва аб абвяшчэньні 4-га ўсесаюзнага конкурсу на лепшую спараную брыгаду і 2-га ўсесаюзнага конкурсу на лепшую станцыю.

Работнікі станцыі абавязаліся палепшыць абслугоўваньне пасажыраў. Арганізаваны дзьве ударныя брыгады, якія займаюцца дапамогай у ліквідацыі чаргі пры касах і абслугоўваньнем пасажыраў.

Раённае кіраўніцтва прыступіла ўжо да практычнай рэалізацыі пастановы СНК і ЦК. Перагледжан штат райкіраўніцтва. Замест 265 чалавек застацца 86. 194 работнікі накіроўваюцца ў пізавыя вытворчыя зьвёньні. Намесьнік начальніка раёну назначан начальнікам вагоннага дэпо. Начальнік аддзелу сувязі—начальнікам дыстанцыі. Тэхнічны дырэктар паравознага дэпо—майстрам дэпо. Функцыі па нармаваньні і ўстанаўленьні расцэнак перадаюцца майстром, начальнікам станцыі, і дыстанцыі. Вялікая работа праводзіцца па падборы кандыдатур у палітаддзел.

Арк. Зарубежны, М. Варонін.

ЗРЫВАЮЦЬ ДАРОЖНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Дарожна-будаўнічы вучастак АДПР-4 у самы разгар работ па дарожным будаўніцтве апынуўся перад сур'ёзнай небясьпекай прарыву.

Асноўнае зараз на АДПР-4—гэта рабочая, пешая і ў першую чаргу, конная сіла.

Асноўнае на ўсіх прарабскіх вучастках і, у прыватнасьці, на трэцім — гэта вывазка каменьня і гравія, колка каменьня і ўкладка такелажу.

На сёньнешні дзень на вучастку прараба 3 асабліва дрэнна з вывазкай каменьня і гравія. Амаль зусім яшчэ не заніданы каманьнем 67 і 68 кілёмэтры. Агулам на вучастак прараба 3 трэба завезьці яшчэ капя 1500 кубамэтраў каменьня. Для таго, каб забясьпечыць вывазку гэтай масы каменьня на дарогу бліжэйшыя два-тры дні, патрэбна, каб на лінію штодзенна выходзіла 2-3 тысячы фурманак. Столькі-ж прыблізна патрэбна для вывазкі на лінію гравія.

Раёны-ж у прыватнасьці, СЛУЦКІ і АСІПАВІЦКІ нічога не робяць для таго, каб забясьпечыць выхад на лінію патрэбнай колькасьці пешай і коннай рабочай сілы. Пакуль што гэтыя раёны нічога канкрэтнага не зрабілі для таго, каб дабіцца пералому ў выхадзе на дарогу рабочай сілы.

Кіраўніцтва СЛУЦКАГА раёну (сакратар РК КП(б)Б т. КРАЦЭР, старшыня РВК т. КНЯЗЕЎ) нічым нават не адказала дагэтуль на адозву Стара-Дарожскага раёну, з якой апошні зьвярнуўся да рабочых, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў Случчыны, заклікаючы іх узмацніць тэмпы і якасьць дапамогі дарожнаму будаўніцтву, забясьпечыць сканчэньне дарогі ў вызначаны тэрмін.

Слуцкі раён павінен штодзенна пасылаць на вучастак прараба 3 ня менш 2600 фурманак і 1 тыс. 500 чал. пешых. Кіраўніцтва-ж раёну абмежавалася «вылучэньнем» у сельсаветы ўпаўнаважаных па арганізацыі выхаду на дарожнае будаўніцтва пешай і коннай рабочай сілы і на гэтым супакоілася. Наколькі фармальна, па-казённому было праведзена на вылучэньне, відаць з таго, што дагэтуль яшчэ ні адзін з упаўнаважаных не зьявіўся на месца прызначэньня і, у выніку такога «кіраваньня» з боку раёну справай дапамогі дарожнаму будаўніцтву, большасьць сельсаветаў раёну ганебна зрывае ўсе пляны дарожных работ.

Так, ПАЛІКАРПАЎСКІ (старшыня сельсавету Корзун, сакратар ячэйкі КП(б)Б — ТАРАСЭВІЧ) і ПАКРЫШАЎСКІ сельсаветы, якія, пачынаючы з 6 ліпеня павінны былі даваць штодзенна ня менш 230 чалавек на колку каменьня, даюць на самой справе менш як палову гэтай колькасьці рабочых. З фурманкамі справа стаіць яшчэ горш.

Ня лепш «кіруе» справай дарожнага будаўніцтва і АСІПАВІЦКІ раён (сакратар РК КП(б)Б т. НОВІКАЎ, старшыня РВК т. МЛОДЭЙ). Кіраўнікі замест канкрэтнай дапамогі, спасьпяшаюцца знайсьці «іншыя, асаблівыя ўмовы раёну, якія не дазваляюць»..., на «некаторыя», ужо «зробленыя» мерапрыемствы і ня могуць рашуча, па-бальшавіцку перабудаваць работу так, каб сканчэньне дарогі ў тэрмін было забясьпечана.

Кіраўніцтва Асіпавіцкага і Слуцкага раёнаў павінна неадкладна перабудаваць работу і ў адпаведнасьці з пастаўленымі перад імі партыяй і ўрадам задачамі па дарбудаўніцтве.

Выязная рэдакцыя «Зьвязды»

А. ЛЕВІН, МІХ. БАГУН, КЛЯШТОРНЫ.

Калгас „Новы быт" першы ў раёне выканаў плян дарбудаўніцтва

Менгаркому КП(б)Б, Райштабу дарбудаўніцтва, Гарсавету, газэце „Зьвязда"

РАПАРТ

Калгас «Новы быт» Крупіцкага сельсавету (Меншчына), мабілізаваўшы калгасную масу закон пастановы Менгаркому КП(б)Б аб своячасовым сканчэньні пляну дарбудаўніцтва, шляхам сацспаборніцтва і ўдарніцтва дабіўся значных перамог. Плян дарожнага будаўніцтва на 8 ліпеня выканан на 106,5 проц.

Улічваючы важнасьць своячасовага сканчэньня дарожнага будаўніцтва, калгас «Новы быт» у парадку саўдапамогі бярэ на буксір адстаючы калгас «Ільліч».

Старшыня калгасу **ЖЭРОМСКІ.**

Сакратар парт'ячэйкі **ШЧАРБОВІЧ.**

Упаўнаважаны Менгаркому КП(б)Б па дарбудаўніцтве **ПІНХАСІК.**

НА ЧЫСТЦЫ ЯЧЭЙКІ ГІСТПАРТУ

На справе давесьці сваю адданасьць партыі

Напружана слухае заля біяграфію тав. Поташа. З цяжкім грузам прыйшоў ён у нашу партыю.

Поташ, выхадзец з сям'і гандляра, у 1913 годзе зблізіўся з нацыяналістычнай партыяй «Поалейцыён». У 1914 годзе ён фармальна ўступае ў яе і вядзе кіруючую работу.

Пасьля Кастрычніка Поташ у партыі Бунда і разам з групай бундаўцаў у 1921 годзе ўступае ў РСДРП(б). Але рэшткі бундызму засталіся ў Поташа і зараз. За 13 год прабываньня ў УсеКП(б) Поташ ня выжыў канчаткова тых рысаў, што вынес з дробна-буржуазнага асяродзьдзя. Вось чаму ў сваёй рабоце ён роўнь рад сур'ёзных палітычных памылак. У барацьбе за генэральную лінію партыі, на практычнай рабоце Поташ яшчэ не даказаў сваёй адданасьці партыі. Гэта выразна праявілася на яго чыстцы.

Расказваючы аб сабе, Поташ імкнецца даказаць, што ён пасьля Кастрычніка ўжо быў блізак да бальшавікоў.

— Уступіўшы ва УсеКП(б), я меў хістаньні ў 1923 годзе ў час барацьбы з трацкісцкай апазыцыяй, — расказвае Поташ.

Але на заўтра ён дабаўляе.

— Я памыліўся. Гэта нельга лічыць толькі хістаньнямі. У часе жорсткай барацьбы з трацкізмам губком адстаіваў правільную лінію. Выступаючы супроць губкому, я такім чынам ваяў трацкісцкую пазыцыю.

Амаль усе выступаўшыя ў спрэчках таварышы адзначылі ролю Поташа ў рабоце праўленьня таварыства гісторыкаў-марксыстаў. Характэрная рыса Поташа — прымірыць, згладзіць вострыя вуглы, адыйсьці ў бок, калі ідзе жорсткая барацьба супроць трацкісцкіх, нацдэмаўскіх, бундаўскіх фальсыфікатараў — выступае тут надта яскрава.

— У таварыстве гісторыкаў-марксыстаў, дзе быў сваякасьлівы стык трацкісцкіх, нацдэмаўскіх і вялікадзяржаўніцкіх элемэнтаў, Поташ выступаў разам з Рыўліным, Югавым і Сорбонтай, — гаворыць тав. Шчэрбакоў.

А ў рабоце Гістпарту? Калі група маладых навуковых працаўнікоў пачала барацьбу з апартуністычным кіраўніцтвам Сорбонты, з трацкісцкімі кантрабандыстамі Югавым і Рыўліным, дзе быў Поташ? Ён не дапамагаў гэтым маладым таварышам, зноў імкнуўся адыйсьці ў бок.

— Як здарылася, што Чарняўскі — бундаўскі апалёгет — выносіць падзяку Поташу за дапамогу ў рабоце? — пытаюцца ў Поташа.

— Я прачытаў 3 главы гэтай кніжкі, рабіў заўвагі, але праглядзіў, што гэта — кантрабанда.

Але гэтая «паўнасьць» не праходзіць міма камісіі.

Кніжку Чарняўскага вы прапусьцілі, а бальшавіцкая рэцэнзія тав. Дудкова на бундаўскую кантрабанду Чарняўскага больш году была затрымана?...

— Я не змог прагледзіць работы Дудкова, быў занят, — адказвае Поташ.

Зразумела чаму член праверкому тав. Віндаровіч ставіць пытаньне:

— Ці не двурушніцтва гэта, калі пасьля раду абяцаньняў выправіць памылкі вы зноў робіце новыя памылкі?

***

Правяраецца тав. Эйдэльман.

Сваё слова ён пачынае з гарачага разаблачэньня партыі Бунда. Але шкадуе ён расказваў аб сабе. Эйдэльман — сын гандляра, у канцы 1914 году ўступіў у Бунд. У нашай партыі лічыцца з 1920 году. Звыш 8 год быў на адказнай партыйнай рабоце.

— У часы грамадзянскай вайны я добраахвотна пайшоў на фронт абараняць савецкую ўладу. Будучы членам Бунду змагаўся з правымі бундыстамі за ўступленьне ў рады партыі, — расказвае пра сябе Эйдэльман.

— Дзе і як вы змагаліся супроць Кастрычніка — пытае камісія.

— Я адсіджваўся, актыўна не працаваў...

— Ці былі ў вас выступленьні супроць савецкай улады?

— Удзельнічаў у дэманстрацыі, якую арганізавалі антысавецкія партыі супроць роспуску ўстаноўчага сойму ў студзені 1918 году.

Як-жа ён — бундавец — ішоў на фронт абараняць савецкую ўладу? Гэту няясьнасьць разьвязвае т. Агурскі, які выразна расказвае, як бундаўцы ў сваіх мэтах пасылалі членаў Бунду ў Чырвоную армію для таго, каб заваяваць давер'е і ўзброіцца для барацьбы з савецкай уладай.

Выкрываючы на словах Бунд, Эйдэльман ўсялякім чынам імкнецца затушаваць свой уласны ўдзел у контррэвалюцыйнай рабоце Бунда. Ён гаворыць, што будучы 8 год членам Бунду, ён нават ня ведаў праграмы Бунду. Аднак, тут-жа выкрываецца няшчырасьць Эйдэльмана.

— Калі вы былі такім ненадзейным бундаўцам, як-жа вас такая асабліва актыўная контр-рэвалюцыйная арганізацыя як Віцебская абрала сакратаром губкому Бунду?

Зноў Эйдэльман імкнецца даказаць, што ён быў «сьляпым арудзьдзем» у руках галоўкі «Бунда», што ніякай

Германскі камсамол—у авангардзе антыфашысцкай барацьбы

БЭРЛІН, 10. (УЛАСН. ІНФАРМАЦ. «ЗЬВЯЗДЫ»). У часе нядаўняй маніфэстацыі гітлераўскай моладзі ў ПЛАЎЭНЕ, камсамольцы раскідвалі лістоўкі, выклікаўшыя замяшаньне ў радох гітлераўцаў. Пачалася пагоня за раскідваўшымі лістоўкі, але затрымаць нікога не ўдалося. Адважны ўчынак камсамольцаў зрабіў вялікае ўражаньне на ўдзельнікаў маніфэстацыі.

У БРЭМЭНЕ камсамолам была арганізавана дэманстрацыя моладзі, у часе якой адзін з камсамольцаў выступіў з прамовай, якая працягвалася ¼ гадзіны.

У некаторых цэхах буйнай гумавай фабрыкі «Фэнікс» у ГАМБУРГУ рабочая моладзь на працягу апошніх трох тыдняў баставала два разы. Забастоўкі скончыліся перамогай моладзі.

ШУКАЮЦЬ КАМУНІСТАЎ

Масавыя аблавы і арышты па ўсёй Германіі

БЭРЛІН, 10 (БЕЛТА). У акрузе ШМАЛЬКАЙДЭНА каля Кассэлю сярод беспрацоўных у апошні час пашыраюцца камуністычныя лістоўкі. У сувязі з гэтым бургамістар распарадзіўся каб «лева-настроеным» беспрацоўным не выдаваліся дапамогі, пакуль ня будуць выяўлены вінаватыя. БРЭСЛАЎСКАЯ паліцыя правяла сёньня вялікую аблаву на рэвалюцыйных рабочых у акругах ЛЯЎБЭН і ЛЕВЗНЭБЭРГ. У часе аблавы нібыта выяўлена вялікая колькасьць камуністычнай літаратуры.

У ФРАНКФУРЦЕ НА МАЙНЕ пры аблаве ў рабочых раёнах выяўлена камуністычная літаратура. Зроблены шмат лікія арышты. Сёньня зроблена таксама вялікая аблава ў рабочым пасёлку БЭРЛІНУ ХАЙМГАРТАНЕ, пры якой таксама нібыта знойдзена шмат нелегальнай літаратуры і размнажальны апарат. У ХІЛЬДЭНЕ арыштавана 25 рэвалюцыйных рабочых. У БРЭМЭНЕ за камуністычную дзейнасьць арыштавана 29 рабочых.

Новая хваля забастовак у Лодзі

ВАРШАВА, 12. (Уласн. інфарм. «Зьвязды»). У подзінскай тэкстыльнай прамысловасьці ўзьнімаецца новая хваля забастовак, якімі рабочыя адказваюць на спробы фабрыкантаў зьнізіць зарплату. Гэтае зьяжэньне ідзе пераважна шляхам ужываньня фабрыкантамі прымусовых водпускаў без аплаты за час водпуску.

Пакуль што адбываюцца пікальныя забастоўкі, якія, аднак, маюць тэндэнцыю да перарастаньня ва ўсеагульную забастоўку. «ДЗЕНЬНІК ВІЛЕНСКІ» піша: «Становішча ў подзінскай тэкстыльнай прамысловасьці вельмі напружанае».

Выкрыцьцё фашысцкай змовы ў Японіі

ТОКІЁ, 11 (Белта). Сёньня ноччу жандармерыя і паліцыя ўзмацнілі ахову розьдзэнцкай міністраў, відных палітычных дзеячаў і дзелавых людзей. Паліцыя сьцьвярджае, што раскрыта змова. Як указвае агэнцтва **Сымбун Рэнго»**, паводле чутак, змова прадугледжвала забойствы радаў вядомых дзеячоў, а таксама і забойства ваеннага міністра **Араки**.

Праведзен рад арыштаў сярод фашысцкіх і іншых рэакцыйных арганізацый. Сярод арыштаваных знаходзіцца галоўны сакратар партыі «Дай Ніхон Сэйсанто» **Судзукі Сэніцы** і каля 8 іншых лідэраў гэтай партыі. Сёньня ўночы арыштаваны ўдзельнікі таемнай нарады, склікаванай партыяй «Дай Ніхон Сайсанто» ў Токіё. Паводле слоў агэнцтва «Сымбун Рэнго», 20 членаў арганізацыі, **Тацыбана**, якія накіроўваліся на месца нарады, заўважылі паліцэйскі кардон, схаваліся.

У прэфэктуры **Ібаракі** арыштаваны члены арганізацыі «Айкокудзуку», удзельнікі якой зьвязаны з майскімі падзеямі, а таксама з забойствам **Інюўэ і Дана**.

На лёнданскай канфэрэнцыі

ЗАЯВА САВЕЦКАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ

ЛЁНДАН, 10 (Белта). Сёньня на пасяджэньні бюро сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі нам. старшыні савецкай дэлегацыі тав. **Межлаук** перадаў старшыні канфэрэнцыі **Макдональду** пісьмовую заяву ад імя савецкай дэлегацыі.

Савецкая дэлегацыя прапануе незалежна ад тых рашэньняў, якія будуць прыняты аб абёме парадку дня канфэрэнцыі, уключыць у гэты парадак дня пры ўсіх умовах наступныя пытаньні: **1. Пакт аб эканамічным нападзе. 2. Пытаньне аб пашырэньні імпартных магчымасьцяй пасобных краін і аб умовах, пры якіх магчыма ажыцьцяўленьне гэтага пашырэньня.**

***

Бюро канфэрэнцыі парашыла склікаць 13 ліпеня пленум эканамічнай камісіі для абмеркаваньня савецкіх прапаноў аб пакце эканамічнага ненападу і аб пашырэньні імпартных магчымасьцяй розных краін. У тойжа дзень будзе абмяркоўвацца французкая прапанова аб заахвочваньні грамадзкіх работ. Перспэктыва абмеркаваньня сурёзных прапаноў выклікала прыкметнае ажыўленьне ў асяродзьдзі журналістаў.

У Н'ю-Ёрку адбылася дэманстрацыя пратэсту супроць прыезду ў ПАЗШ прадстаўнікоў германскага ўраду, нац-сац. Відэмана і Шнэйдэра. Дэманстрацыя скончылася цяжкай сутычкай з паліцыяй. НА ЗДЫМКУ: Паліцыя атакуе дэманстрантаў.

Англа-савецкая гандлёвая канфэрэнцыя

ЛЁНДАН, 11 (Белта). Агэнцтва «Рэйтэр» паведамляе: «Наступнае пасяджэньне англа-савецкай гандлёвай канфэрэнцыі адбудзецца ў міністэрстве гандлю ў бліжэйшыя дні, відавочна 14 ліпеня. Будзе абмяркоўвацца пытаньне аб тым, якую форму павінен мець новы англа-савецкі гандлёвы дагавор. Пытаньне аб збалянсаванні гандлю паміж абедзьвюма краінамі ўжо было вельмі падрабязна разгледжана і, як указваюць, дыскусію па гэтым пытаньні можна лічыць скончанаю. Пытаньні адносна формы новага дагавору, як чакаюць, займуць шмат часу і патрабуюць раду пасяджэньняў, якія, магчыма, працягнуцца да канца месяца».

Сустрэча тав. Радэка з польскімі журналістамі

ВАРШАВА, 11 (БЕЛТА). Учора ў паўнамоцным прадстаўніцтве СССР ў Варшаве адбыўся прыём, на якім тав. **Радэк** сустрэўся з прадстаўнікамі польскага друку. На прыёме быў прадстаўлен друк усіх напрамкоў і былі паасобныя палітычныя дзеячы, у тым ліку кіраўнік саюзу прамысловцаў **Вержбіцкі**. На прыёме прысутнічалі, між іншым, рэдактар «Газэты польскай» **Медзінскі**, б. міністар фінансаў і публіцыст **Матушэўскі**. Міністэрства замежных спраў было прадстаўлена начальнікам усходняга аддзелу **Мэтцэлем** і начальнікам аддзелу друку **Пшэсмыцкім**. Жвавая гутарка тав. **Радэка** з журналістамі зацягнулася на некалькі гадзін.

Савецка-турэцкая чыгуначная канфэрэнцыя ў Тыфлісе

ТЫФЛІС, 11 (БЕЛТА). 10-га ліпеня ў Тыфлісе адкрылася савецка-турэцкая чыгуначная канфэрэнцыя, якая працуе нецца каля трох тыдняў. Турэцкая дэлегацыя была прынята старшынёю Закаўкаскага Саўнаркому тав. **Мусабэкавым** і нам. старш. Закаўкаскага СНК тав. **Джугелі**. 10-га ліпеня ўвечары ды рэктар закаўкаскіх чыгунак тав. **Розэнцвэйг** наладзіў прыём у гонар турэцкіх госьцей, на якім прысутнічалі члены ўраду і адказныя работнікі Наркамшляху і закаўкаскіх чыгунак.

Замежная хроніка

* 11 ліпеня ўвечары з Стамбулу на параходзе **«Франц Мэрынг»** у СССР выехала турэцкая каманда футбалістаў. Прадстаўнікі турэцкіх спартыўных і грамадзкіх арганізацый, а таксама савецкая калёнія на чале з паўнамоцным прадстаўніком тав. **Сурыцам** цёпла праводзілі ад'яжджаючых.

* На параходзе **«Франц Мэрынг»** з Турцыі выехаў у Адэсу акадэмік **Марр**.

* Галоўнае кіраўніцтва грамадзянскага паветранага флёту СССР атрымала паведамленьне з Амэрыкі аб тым, што лётчык **Уілі Пост**, калі будзе спрыяючае паветра, пачынае 11-га ліпеня свой пералёт, каб пабіць рэкорд хуткасьці пералёту вакол сьвету. Першую пасадку **Пост** парашыў зрабіць у **Бэрліне**, другую — у **Нова-Сібірску**. У Маскве лётчык спыняцца ня будзе. Увесь пералёт ён намеран зрабіць за 4 сутак і дзьве гадзіны, у той час, як рэкорд устаноўлены ім і лётчыкам **Гэтты**, быў 8 сутак 15 гадз. 40 хвілін. Пост ляціць адзін на самалёце «Лекхід».

* Паводле вестак галоўнага кіраўніцтва грамадзянскага паветранага флёту італьянскі лётчык **Мара О-дэ Бэрнарды** вылятае 15-га ліпеня ў беспасадачны палёт з **Міляну ў Маскву**. У Маскве лётчык чакаецца 14 ліпеня. Пералёт арганізоваа таварыствам «Аэрапляна Капроні» з рэклямнай мэтай. Авіятар ляціць на самалёце «Капроні III» з маторам Ізолта-Фраскіні, магутнасьцю ў 750 конскіх сіл.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Урачыстая закладка вялікага опэрна-драматычнага тэатру

Учора на пляцы Парыскай Камуны ў Менску ў адзнаку 13-й гадавіны вызваленьня БССР ад белагвардзейцаў адбылася ўрачыстая закладка вялікага опэрна-драматычнага тэатру БССР.

На ўрачыстай закладцы прысутнічалі старшыня ЦВК БССР тав. ЧАРВЯКОЎ, старшыня Саўнаркому тав. ГАЛАДЗЕД, Наркамасьветы тав. ЧАРНУШЭВІЧ, Наркамфін тав. ХАЦКЕВІЧ, рабочыя ўдарнікі менскіх прадпрыемстваў, ударнікі вучобы, прадстаўнікі літаратуры і мастацтва, байцы Менскага гарнізону і іншыя.

Роўна а 1-ай гадзіне Наркамасьветы тав. ЧАРНУШЭВІЧ адкрыў мітынг, прысьвечаны закладцы вялікага тэатру.

Ва ўступным слове тав. ЧАРНУШЭВІЧ падкрэсьліў, што закладка новага тэатру зьяўляецца пачаткам вялікай справы на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

З кароткімі прамовамі выступілі т. т. ГАЛАДЗЕД, КАРАНЕЎСКІ, заслужаны артыст рэспублікі тав. ГІТГАРЦ, і галоўны інжынэр-архітэктар, аўтар праекту тав. ЛАЎРОЎ.

ТАВ. ГАЛАДЗЕД ЗАЛАЖЫЎ ПЕРШЫЯ ЦАГЛІНЫ ФУНДАМАНТУ БУДУЧАГА ВЯЛІКАГА ТЭАТРУ.

У Менску адкрываецца аэра-клюб

15 ліпеня у Менску АДКРЫВАЕЦЦА ЎСЕБЕЛАРУСКІ АЭРАКЛЮБ. Часова ён будзе працаваць у клюбе заводу імя Молатава.

Усебеларускі авіяклюб павінен стаць рассаднікам авіяцыйнай культуры сярод працоўных БССР, прапагандыстам і байцом за ўзмацненьне авіяцыі і яе лётных кадраў.

Для забесьпячэньня бесьперапыннай сыстэматычнай работы клюбу неабходна шырокае падтрыманьне з боку ўсёй грамадзянасьці, усіх арганізацый і ўстаноў. Членам Усебеларускага аэраклюбу павінен стаць кожны працоўны Трэба, каб кожная арганізацыя, ўстанова была юрыдычным членам клюбу.

Стварэньне Усебеларускага аэраклюбу павінна стаць справай усяго пралетарыяту і калгаснага сялянства рэспублікі.

РОЗАНАЎ.

Чэрвеньшчына выканала плян працудзелу насельніцтва ў дарбудаўніцтве

(Прывітальная тэлеграма цэнтральнага штабу па дарожнаму будаўніцтву

Чэрвень, сакратару райкому КП(б)Б, старшыні райвыканкому. Вінішую рабочых, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў з бліскучай перамогай, атрыманай на фронце барацьбы з бездарожжам.

Ваша перамога зьяўляецца яскравым паказальнікам таго, што пад кіраўніцтвам партарганізацыі працоўныя Чэрвеньшчыны зразумелі важнасьць дарожнага будаўніцтва, значэньне добрых дарог у барацьбе за поўную і хуткую ўборку ўраджаю.

Працягвайце далейшую барацьбу за поўную ліквідацыю бездарожжа. Прад стаўце сьпіс лепшых калгасаў, сельсаветаў, асобных таварышоў для прэміяваньня. Шліце падрабязную інфармацыю аб праробленай рабоце для перадачы вашага вопыту іншым раёнам.

Старшыня Цэнтральнага Штабу па дарожнаму будаўніцтву ФРУМКІН.

Зьлёты юных авіямадэлістаў

Менскі гарсавет Асоавіяхіму праводзіць падрыхтоўчую работу да ўсесаюзнага зьлёту юных авіямадэлістаў, які адбудзецца ў Маскве ў другой палове жніўня. Ва ўсіх піянэрскіх лятерах арганізуюцца сэкцыі юных авіямадэлістаў.

15 ліпеня ў Менску склікаецца агульна-гарадзкі зьлёт, на якім будуць прадэманстраваны лепшыя дасягненьні ў авіямадэльнай справе.

Арганізуюцца каротка-тэрміновыя курсы інструктароў для ўкараненьня авіямадэльнай справы ў школах. Намячаецца скліканьне ў Менску ўсебеларускага зьлёту юных авіямадэлістаў, які выдзеліць дэлегатаў на ўсесаюзны зьлёт.

Адкрыцьцё тэатру Мюзік-Хол

13 ліпеня ў летнім тэатры саду «Пра фінтэрн» у Менску пачынаюцца гастролі Мюзік-хола. У праграме выступленьні мастацкай брыгады Дамэцу з удзелам савецкіх і замежных акторaў.

З найбольш выдатных акторaў трэба адзначыць выканаўцу народных сьпеваў **Мэнгадэлі**, жанчыну-трансфармацтара **Кавэцкую**, атракцыёнаў **Марчас** і інш.

Для гастроляў прыяжджаюць таксама народныя акторы рэспублікі браты **Адэльгейм**, ансамбль дзяржаўнага маскоўскага абласнога драматычнага тэатру. У рэпэртуары «Казнь Трыльбі», «Кручина» і інш.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

— Гэтымі днямі ў сэктары «ЛІМ» Дзяржаўнага Выдавецтва Беларусі выйшлі з друку тамы I і II збору твораў **Міхася Чарота**. Неўзабаве выходзіць у сьвет: **«Над ракой Арэсай» Я. Купалы** (рэч, якая друкавалася ў «Зьвязьдзе»), III-е выд. аповесьці **Гапавача «Спапох на загонах»**, II-е выд. раману **Р. Мурашкі «Сын»**, том, I твораў **Андрэя Александровіча**.

— У пляне разгортваньня творчае падрыхтоўкі да 1-га Усесаюзнага зьезду савецкіх пісьменьнікаў арганізацыйны камітэт СССП вызначыў на бліжэйшы час шэраг мерапрыемстваў. Так, 25 ліпеня ў Доме Пісьменьніка адбудзецца нарада па творчых пытаньнях паэзіі (дакладчык — **Ал. Кучар**); 29 жніўня—нарада па пытаньнях прозы (дакл.—**Я. Бранштэйн**). У сярэдзіне жніўня арганізуецца вечар абмеркаваньня апошніх нумароў часопісі **«Полымя рэвалюцыі»**.

— У мэтах непасраднага азнаямленьня пісьменьнікаў з працэсамі сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне, арганізацыйны камітэт СССП разьмеркаваў сярод творчага актыву пісьменьнікаў **12 камандыровак** у буйнейшыя прамысловыя цэнтры СССР і **36** камандыровак па Савецкай Беларусі.

— На апошнім пасяджэньні вышэйпрыведенай камісіі арганізацыйнага камітэту абмяркоўвалася пытаньне пра складаньне **гісторыі №-скай Самарскай кавалерыйскай дывізіі**. Намечаны рад мерапрыемстваў па аказаньні дапамогі ў напісаньні гісторыі. Для практычнага ўдзелу ў гэтай справе выяжджаюць у творчую камандыроўку **т. т. К. Чорны і З. Бядуля**.

Л.

Хроніка

* **Шэсьць брыгад Беларускай Акадэміі Навук выяжджаюць у 12 раёнаў БССР для іх вывучэньня і эканамічнага абпісаньня.** Будуць абпісаны: Дзяржынскі, Менскі, Старобінскі, Пятрыкоўскі, Лельчыцкі і інш. раёны. Брыгады прабудуць на месцы 1 з пал. месяца.

* **418 кінаперасовак накіравала Белдзяржкіно ў раёны** для абслугоўваньня саўгасаў, калгасаў і МТС на час прапалачнай і ўборачнай кампаніі. Менскім аддзяленьнем Белдзяржкіно накіравана 12 агітбрыгад (БЕЛТА).

* **Скасавана пастанова Менскага гарсавету аб устанаўленьні на карысьць піянэрлягераў накідкі на білеты** ва ўсе кіно-тэатры гораду. СНК адзначае, што Менскі гарсавет ужо некалькі раз выносіў аналёгічныя пастановы, якія пярэчаць заканадаўству, і ўказаў на недапушчальнасьць гэтага.

* Менскі гарсавет даручыў АТС **тэлефанізаваць 40 буйнейшых саўгасаў і калгасаў** Меншчыны.

* Мастак **Ахрэмчык** працуе над вялікай карцінай **«Другі зьезд партыі»** для Музэю рэвалюцыі.

* **На ленінградзкай фабрыцы Белдзяржкіно** прыступілі да здымкаў новай карціны па сцэнарыю вядомага сцэнарыста **Прута** на тэму аб грамадзянскай вайне на Беларусі. Рэжысэр тав. **Корш**.

* Сёньня, 12 ліпеня, **менская чырвонасьцяжная дывізія імя Дзяржынскага адзначае 15-годзьдзе свайго слаўнага шляху.** Для ўдзелу ў сьвяткаваньні запрошаны дэлегацыі калгасьнікаў, а таксама Дзяржынскага раёнаму партыі ў Маскве, які зьяўляецца шэфам дывізіі.

* Белкаапсаюз вылучыў **магазын № 1 ЗРК** заводу імя Варашылава, як узорна паказальны. Да гэтага магазыну прымацован адказны інструктар.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Замежная хроніка

* 11 ліпеня ўвечары з Стамбулу на параходзе **«Франц Мэрынг»** у СССР выехала турэцкая каманда футбалістаў. Прадстаўнікі турэцкіх спартыўных і грамадзкіх арганізацый, а таксама савецкая калёнія на чале з паўнамоцным прадстаўніком тав. **Сурыцам** цёпла праводзілі ад'яжджаючых.

* На параходзе **«Франц Мэрынг»** з Турцыі выехаў у Адэсу акадэмік **Марр**.

* Галоўнае кіраўніцтва грамадзянскага паветранага флёту СССР атрымала паведамленьне з Амэрыкі аб тым, што лётчык **Уілі Пост**, калі будзе спрыяючае паветра, пачынае 11-га ліпеня свой пералёт, каб пабіць рэкорд хуткасьці пералёту вакол сьвету. Першую пасадку **Пост** парашыў зрабіць у **Бэрліне**, другую — у **Нова-Сібірску**. У Маскве лётчык спыняцца ня будзе. Увесь пералёт ён намеран зрабіць за 4 сутак і дзьве гадзіны, у той час, як рэкорд устаноўлены ім і лётчыкам **Гэтты**, быў 8 сутак 15 гадз. 40 хвілін. Пост ляціць адзін на самалёце «Лекхід».

* Паводле вестак галоўнага кіраўніцтва грамадзянскага паветранага флёту італьянскі лётчык **Мара О-дэ Бэрнарды** вылятае 15-га ліпеня ў беспасадачны палёт з **Міляну ў Маскву**. У Маскве лётчык чакаецца 14 ліпеня. Пералёт арганізоваа таварыствам «Аэрапляна Капроні» з рэклямнай мэтай. Авіятар ляціць на самалёце «Капроні III» з маторам Ізолта-Фраскіні, магутнасьцю ў 750 конскіх сіл.

15-га ліпеня, а 7 гадз. вечара, **у доме Ураду** (6-ты паверх, 13 пакой)

Народны Камісарыят Працы БССР

склікае

НАРАДУ

усіх загадчыкаў аддзелаў кадраў наркаматаў цэнтральных і гарадзкіх устаноў і прадпрыемстваў г. Менску.

З прычыны асаблівай важнасьці пытаньняў парадку дня яўка абавязкова.

14-га ліпеня ў 6 гадз. вечара, у памяшканьні клюбу імя СТАЛІНА адбудзецца

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКАЯ ШЭФСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ.

Парадак дня:
1. Вынікі апошняга пленуму ГК КП(б)Б (тав. **ШУЛЬКІН**).
2. Справаздача шэфсавету.
3. Выбары гаршэфсавету.

Пасьля канфэрэнцыі—МАСТАЦКАЯ ЧАСТКА.

Мандаты ў гаршэфсавеце з 4-х да 7 гадз.

АРГКАМІСІЯ.

ПАРТЫЙНАЕ ВЫДАВЕЦТВА.—СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ ДзВБ.

ВЫШЛІ З ДРУКУ, паступілі ў продаж і рассылаюцца на месцы

НОВЫЯ КНІГІ:

СТАЛІН І., ПОСТЫШАЎ П. І ГІКАЛО М.—Прамовы аб рабоце ў вёсцы. Стар. 102. Тыр. 20.000.—1933 г. Ц. 40 к.

ІСАКАЎ Г.—Пастаўка збожжа дзяржаве—першапачатковая задача. Стар. 16 тыр. 25.000—1933 г. Ц. 10 к.

БЯРНОЎСКІ І., ЗАГАРЭЛЬСКІ А. І МІРКІН В.—На барацьбу за стратамі пры ўборцы і абмалоце зярнёвых культур. Стар. 32. Тыр. 25.000.—1933 г. Ц. 15 к.

НА ЯЎРЭЙСКАЙ МОВЕ

СТАЛІН І., ПОСТЫШАЎ П. І ГІКАЛО М.—Прамовы аб рабоце ў вёсцы. (Нацсэктар ДВБ). Стар. 110. Тыр. 6.000.—1933 г. Ц. 40 к.

ІСАКАЎ Г.—Пастаўка збожжа дзяржаве—першапачатковая задача. Стар. 16 тыр. 2.000.—1933 г. Ц. 10 к.

ПАТРАБУЙЦЕ ва ўсіх кнігарнях і кіёсках ДзВБ, БАКТ'у, РСС і Саюздруку!

ОБЩЕСТВО ПРОЛЕТАРСКОГО ТУРИЗМА И ЭКСКУРСИЙ **ОПТЭ**

БЮРО ПАДАРОЖЖАЎ ЦС ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО

ЎСЕ БАЗЫ БЮРО ЎНОЎ АДРАМАНТАВАНЫ

і забясьпечаны харчаваньнем.

Члены ОПТЭ пры запісу атрымліваюць скідку ў разьмеры 10 проц.

ЗАПІСЬ НА МАРШРУТЫ Ў МЯСЦОВЫХ САВЕТАХ ОПТЭ.

Гукавы кіно-тэатр ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“** з 13 ліпеня

ЗДАНЬ, ЯКАЯ НЕ РАРОЧВАЕЦЦА

У ролях: О. Жызнёва, В. Фэрдынандаў і М. Штраух

ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ

ПАЧАТАК: 6 гадз., 7 гадз. 30 м., 9 гадз. і 10 гадз. 30 м.

КАСА—ад 1 гадз. дня.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ“ Пачат. 1-га сэансу ў 6 гадз. веч.

СЁНЬНЯ 13 ЛІПЕНЯ І ШТОДЗЕННА

МАСТАЦКІ КІНО-РАМАН

„ТАЙНА КАРАТАЎ“

У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ: **В. ГАРДЗІН, Н. КУТУЗАЎ І Жэня ПЫРАЕВА.**

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ. Мастацкі фільм **ГУРАГАН**

„СПАРТАК“. Каса—з 3 г. 30 м. Мастацкі фільм **У АГНІ НАРОДЖАНАЯ** драма ў 5 частках.

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР. — 2-я СЭРЫЯ — 2-я Чырвоныя Д'яблаты

Інстытут ЛІМ Белдзяржкіно і саюз савецкіх мастакоў БССР— *15 ліпеня* ў 8 гадз. вечара ў Доме Пісьменьніка АДБУДЗЕЦЦА

ТВОРЧЫ ВЕЧАР

мастака **В. В. ВОЛКАВА.**

Даклад аб творчасьці мастака зробіць вучоны спэцыяліст Інстытуту ЛІМ т. УСС.

14 і 15 ліпеня ў памяшканьні Дому Пісьменьніка мастацкая выстаўка твораў т. Волкава.

Выстаўка адчынена ад 11 да 2 гадз. і ад 5 да 8 г. веч. Уваход вольны.

Слуцкі райкамбінат мясцовай прамысловасьці

ЛІКВІДУЕЦЦА

з 1 ліпеня 1933 года.

Усе ўстановы і арганізацыі, маючыя прэтэнзіі да камбінату, павінны прад'явіць **да 20-га ліпеня г. г.,** пасьля чаго ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць.

Ліквідком.

Горацкі дзенны рабочы факультэт імя Галаздэда

абвяшчае

ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ

на 1-ы, 2-гі і 3-ці курсы дзеннага рабфаку

Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй на 100 проц. (45—55 руб.). Прыём заяў—з 20-га чэрвеня да 25-га жніўня. Іспыты—з 25-га жніўня па 1-е верасьня. Пачатак заняткаў з 1 верасьня 1933 г.

Адначасова праводзіцца прыём студэнтаў на вячэрні рабфак без адрыву ад вытворчасьці на 1-ы, 2-гі і 4-ы курсы.

Да заяў неабходна далучыць дакументы (у арыгіналах), згодна даведніка НКАсьветы для паступаючых на рабфак. Таксама для адказу неабходна дасылаць паштовых марак на 40 кап.

Т.-г., якія прыедуць на іспыты, павінны ўзяць свае рэчы, бялізну і пасьцельныя прылады, бо ў выпадку залічэньня, яны адразу-жа прыступаюць да заняткаў.

Заявы накіроўваць па адрасе: г. Горкі БССР, рабфак імя Галаздэда.

Дырэкцыя.

ПРАДАЕЦЦА

канторская мэбля і розны канц. і гасп. інвэнтар. Даведацца: Камсамольская, 17-10, Менская аддз. канторы „Сантэхстрой“, ад 10 да 4 г.

ЗРК ф-кі „КАМУНАРКА“ ПАТРЭБЕН

ГАЛОЎНЫ БУХГАЛЬТАР.

ЗВАРАЧАЦЦА: 3-я Лекерта, праўленьне ЗРК.

ТОРГСІН

ПУЦЁЎКІ

Ў САНАТОРЫІ НА ПАЎДНЁВЫЯ КУРОРТЫ

па цане ад 100 да 120 р. зол. у мес. (жыльлё, стол і поўнае лячэньне)

МОЖНА АТРЫМАЦЬ

у ВО **„ТОРГСІН“**

„МОСКВА, ЦЕНТР. КУЗНЕЦКИЙ МОСТ, 14 ГЛАВНАЯ КОНТОРА РАЗНЫХ ТОВАРОВ“.

ЗАЯЎКІ НА ПУЦЁЎКІ ЗАДАВАЛЬНЯЮЦЦА НЕАДКЛАДНА.

Пераводатрымальнікам выключна льготныя умовы.

Пры жаданьні хворых ТОРГСІН прадастаўляе кансультацыі дактароў на прадмет вызначэньня курортаў.

ЗАГАД № 334

па НАРОДНАМУ КАМІСАРЫЯТУ ЗЯМЛЯРОБСТВА БССР

ад 8 ліпеня 1933 г.

Студэнтаў III і IV курсаў Горацкага с.-г. інстытуту адкамандыраваць 10 ліпеня г. г. у інстытут для заканчэньня вучобы.

НАРКОМ ЗЯМЛЯРОБСТВА БССР

БЭНЭК.

Дырэкцыя, фабком і бюро ячэйкі ЛКСМБ беларускай фабрыкі мэханізаванага лічэньня выказваюць сваё глыбокае спачуваньне старшыні фабкому тав. **РАБІНОВІЧУ Л. Л.** з прычыны заўчаснай сьмерці

ЯГО СЯСТРЫ.

Бабруйскаму лесакамбінату **патрабуюцца:**

1. Інжынэр-лесатэхналёг для работы ў кіраўніцтве камбінату ў якасьці загадчыка вытворчай групай дрэвапрадоўкі (будаўнічых дэталяй, экспарту, тар-ы).
2. Інжынэр-мэханік для работы ў кіраўніцтве камбінату ў якасьці галоўнага мэханіка.
3. Інжынэр-лесатэхналёг для работы ў Белдраўляным цэху камбінату па тэхналёгічным плянаваньні.
4. Інжынэр-лесатэхналёг або мэханік для работы ў кіраўніцтве камбінату ў якасьці заг. тэхнікай басьпекі.
5. Тэхнік па піластаўнай справе ў якасьці інструктара.

Аплата па згодзе.

Кватэрамі забясьпечваюцца.

Беларускі сельска-гаспадарчы інстытут у г. Горках

АБВЯШЧАЕ

АСЕНЬНІ НАБОР СТУДЭНТАЎ

НА НАСТУПНЫЯ ФАКУЛЬТЭТЫ:

1. **Зоатэхнічны** (рыхтуе зоатэхнікаў па буйнай рагатай жывёле).
2. **Аграхімії і глебазнаўства** (рыхтуе спэцыялістаў па хэмізацыі сельскай гаспадаркі).
3. **Кормаздабываньня і насенняводства** (рыхтуе агранамаў па кормаздабываньню і насенняводству).
4. **Ільна і канопляў** (рыхтуе агранамаў па ільнаводству і канапляводству).
5. **Эканомікі і плянаваньня сельскай гаспадарчы** (рыхтуе эканом. плянавіхоў с.-г., арганізатараў вытворчасьці, працы і тэх. нармаваньня).
6. **Арганізацыі тэрыторыі** (рыхтуе спэцыялістаў па зямлеўпарадкаваньню саўгасаў і калгасаў).
7. **Рабочы факультэт.**

Прыём заяў праводзіцца да 1 верасьня, 1933 г. Заявы падаваць на імя дырэкцыі сельска-гаспадарчага інстытуту гор. Горкі БССР.

Да заявы патрэбна прылажыць наступныя дакументы:

1) анкету засьведчаную партыйнымі, прафэсыянальнымі або савецкімі арганізацыямі; 2) даведку аб узросьце; 3) аб сацыяльным і матар'яльным становішчы бацькоў для сялян-аднаасобнікаў—даведку аб с.-гасп. падатку; 4) аб выбарчых правах; 5) аб стане здароўя; 6) аб вайсковай павінасьці; 7) аб адукацыі (арыгінал); 8) дзьве фотакарткі і 9) паштовых марак на 40 кап.

Усе прынятыя забясьпечваюцца інтэрнатам (за выключэньнем самей студэнтаў і стыпэндыяй згодна палажэньня.

Адначасова з гэтым праводзіцца набор на завочны сэктар па вышэйпаказаных спэцыяльнасьцях.

Дырэктар Інстытуту БАРЫСЭВІЧ.

УКРАДЗЕН конь чырвона-шэрай масьці, узрост 4 г. Просьба паведаміць: п. а. Забалоцьце, Забалоцкага сельсавету Рагачоўскага раёну, пас. Зялёны дуб, Лукашову Д. С.

УКРАДЗЕН конь гнедай масьці, 4 г. Просьба паведаміць: п. а. Забалоцьце, Забалоцкага сельсавету, Рагачоўскага раёну, пас. Зялёны Дуб, БАРЭКАЗУ Я. Ф.

ЕЛЬСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ **ДЗЯРЖБАНКУ** аа пратэрміноўку плацяжоў

ПРАДАЕ

наступныя тавары арцелі „Чырвоны хэмік“:

Смала хвалёвая	7675 кгр.	на 3721	руб.
Шыпінар	2333 „	„ 2958	„
Вугаль хвалёвы	16 тон	„ 4224	„
Парашок серкавы	27 „	„ 17415	„
Смала бярозавая	4290 кгр.	„ 1844	„
Сьпірт дрыўляны	6400 „	„ 4672	„
Бочкі дрыўляныя	43 шт.	„ 2760	„
Бочкі жалезныя	23 шт.	„ 5750	„
Дзёгаць	500 кгр.	„ 1500	„
УСЯГО:		44814	„

Тавар знаходзіцца на ст. Ельск і Слава вечна П.З. чыг.

Зварачацца: Ельск, БССР, аддзяленьню Дзяржбанку.

Даводзіцца да ведама, што з 20 чэрвеня 1933 г. Чашніцкі цагельны завод **ЛІКВІДУЕЦЦА.**

Тыя ўстановы і асобы, якія маюць прэтэнзіі, павінны прад'явіць іх **не пазьней 25 ліпеня** 1933 года.

Пасьля чаго ніякія прэтэнзіі прымацца **на будуць.**

ліквідком.

ПАТРЭБЕН пам. бугальтара

ЗВАРАЧАЦЦА: Савецкая, 63, да заг. сталоўкі.

Клімавіцкі пчалаводны тэхнікум

абвяшчае

АСЕНЬНІ ПРЫЁМ

на 1-ы курс тэхнікуму. Прыём заяў да 15-га жніўня.

Прымаюцца таварышы, спонтаўшыя сяньгодку, згодна правіл прыёму ў тэхнікумы. Тэрмін навучаньня 3 гады.

Дакументы накіроўваць: г. Клімавічы, Пчалаводны Тэхнікум.

Дырэкцыя.

Беларускі дзяржаўны **ТАРФЯНЫ** інстытут, тэхнікум і рабфак

абвяшчае

АСЕНЬНІ НАБОР на інурс

У **інстытут** — на інжынэра-вытворчае аддзяленьні.

У **тэхнікум** — на вытворчае аддзяленьне.

У **рабфак** — торфінстытуту і энергаінстытуту.

Прыём заяў да 1 жніўня.

Да заявы павінны быць прыкладаны дакументы, згодна палажэньня аб прыёме ў ВНУ, тэхнікумы і рабфакі.

Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.

Заявы дасылаць па адрасу: торфінстытут, торфтэхнікум і рабфак — Менск, Чырвонаармейская, 16.

Аб палажэньні іспытаў будзе абвешчана дадаткова.

Дырэктар ВЕРЫЧАЎ.

ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: Адказны рэдактар—21-353; сакратарыят—21-354, сэктары: сельска-гаспадарчы і нац.-культур нага будаўніцтва—21-356; партсэктар—21-352; сэктары: прамысловы, савецкага буда